ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 35-ы
№ 78 (2131)
27 верасня 1966 г.
АЎТОРАК
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

Восень... Каго яна не радуе сваімі багатымі дарамі — золатам зерня, буйнымі клубнямі бульбы, сакавітымі сцяблами кукурузы, духмяным пахам антонаўскіх яблыкаў! Радуецца хлебароб добраму ўраджаю — выдатна папрацаваў ён вясною і летам. А цяпер можна пажынаць плён сваёй працы. У нашай рэспубліцы стала ўжо традыцыяй праводзіць у гэтую добрую пару святы ўраджаю.

У святочным убранні лясная паляна. На дрэвах — лозунгі, заклікі. Сюды сабраліся рабочыя саўгаса «Косава» Івацэвіцкага раёна. На часова зробленую эстраду ўзыходзіць самы дарагі госць—Ураджай. Ён віншуе прысутных з хлебаробскім святам. Затым з кароткім словам выступаюць кіраўнікі саўгаса, яны дзякуюць даяркам, паляводам, механізатарам за выдатную працу, уручаюць ім каштоўныя падарункі. Прысутныя разглядаюць снапы пшаніцы, высокія сцяблы кукурузы, важкія клубні бульбы і цукровых буракоў, знаёмяцца з майстрамі высокага ўраджаю.

На свята прыехалі ўдзельнікі мастацкай самадзейнасці з Брэста, Івацэвічаў і мясцовыя артысты. Цікавы канцэрт змяніўся танцамі, затым былі конкурсы на лепшае выкананне песень, вершаў, віктарыны, атракцыёны, масавыя гульні.

На здымках: 1. Выступае хор саўгаса «Косава», 2. «Ураджай» віншуе ўдзельнікаў свята.

Фота А. ВЯЛІКАСЕЛЬЦА.

50 год насустрач вялікай даце

Аляксандр АПАНАСЕНКА:

І МІНУЛАЕ, І СУЧАСНАЕ

Зноў на рэкламных шчытах — яркія, маляўнічыя афішы Дзяржаўнага ансамбля танца БССР. Ансамбль пачаў свой сёмы канцэртны сезон. Да канца верасня ён будзе выступаць на сцэне акруговага Дома афіцэраў, потым паедзе ў гастрольную паездку па ГДР, а вярнуўшыся, накіруецца ў Сібір — па былым маршруце Фестывалю беларускага мастацтва ў Расіі.

Святочны рэпертуар ансамбля — гэта яго цяперашняя праграма. Пра тое, як яна стваралася, мы папрасілі расказаць мастацкага кіраўніка калектыву, заслужанага артыста УССР і заслужанага дзеяча мастацтваў БССР Аляксандра Рыгоравіча Апанасенку.

— Наша новая праграма — вынік шматгадовых пошукаў. На першым часе, калі калектыў толькі ўсталёўваўся, галоўным для нас было збіранне этнаграфічных матэрыялаў і простае іх выкарыстанне. Паступова, аднак, задача пачала ўскладняцца. Нельга ж будаваць праграму на адных і тых жа аднастайных па характары нумарах. Відаць, выйсце ў тым, каб, абапіраючыся на народную харэаграфію, пашыраць «граніцы» танца, усяляк драматызаваць яго, насычаць дзеяннем. Інакш цяжка адгукацца на складаныя патрэбы часу, расказаць пра тое, што хвалюе сённяшняга гледача. Ад танца — да харэаграфічнай карцінкі, да драматызаванага дзеяння — вось шлях, па якім мы пайшлі. Пошукі яшчэ не закончаны, і пакуль можна гаварыць толькі пра першыя вынікі. Зазначу толькі, што гэтая праблема хвалюе не адных нас. Пра тое, у якім напрамку развіваецца народным калектывам, спрачаюцца сёння і харэографы, і вакалісты, і інструменталісты. Але вернемся да нашай праграмы.

Яна адкрываецца аднаактовым харэаграфічным спектаклем «Беларуская партызанская» (музыка Яўгена Глебава, мастак Яўген Чамадураў). Спектакль ідзе ў новай рэдакцыі. Мы ўзмацнілі гучанне асобных эпізодаў і сцэн, зрабілі больш эпічнымі вобразы маці-Радзімы, Камандзіра. Буйным планам паказаны цяпер батальныя сцэны, сцэны ў партызанскім лагеры, больш выразны стаў малюнак танцаў.

Другое аддзяленне адкрываецца харэаграфічнай сцэнкай «Вяртанне да жыцця». Гэта хвалюючая гісторыя дзяўчыны, якой вернуты зрок.

Наступны нумар—харэаграфічная карцінка «Лявоніха на кірмашы» — адначасова і танец, і этнаграфічная замалёўка. Яе дзеючыя асобы традыцыйныя персанажы народных паказаў— муж і жонка і іх дружбакі, музыканты, гандляры, шынкар, падлеткі...

Яркая сюжэтная лінія вызначае танцы «Беларуская кадрыля», «Беларускі казачок».

Балетмайстар-рэпецітар ансамбля заслужаны артыст БССР Георгій Мартынаў паставіў па матывах беларускай народнай песні «Ой хацела мяне маці» танец «Жаніхі».

Другі член калектыву, педагог-рэпецітар і саліст Віктар Цюрын выступіў як пастаноўшчык танца «Беларускі крыжачок». На музыку артыста Мікалая Коншына пастаўлены танец «Беларуская мяцеліца». У ім выкарыстаны элементы народных гульняў, калядныя касцюмы.

Праграма будзе дапоўнена лепшымі нумарамі мінулых паказаў—«Беларуская рапсодыя», «Лянок», «Бычкі», «Чардаш».

А цяпер пра харэаграфічныя спектаклі, якія мы мяркуем паставіць у бліжэйшы час.

Кампазітар Яўген Глебаў піша для нас музычную карціну «За намі Масква». Мы хочам аднавіць сродкамі танца адзін з самых хвалюючых эпізодаў Вялікай Айчыннай вайны—подзвіг 28 герояў-панфілаўцаў. І яшчэ адна задума — «Свята ўраджаю з вяселлем». Не, гэта не будзе рэстаўрацыя старых звычаяў і абрадаў. Наадварот, хочацца паказаць свята такім, якім яно будзе праз шмат гадоў, у будучыні.

Наш ансамбль — малады калектыў. Яму ўсяго сем гадоў. Маладыя ў нас і выканаўцы, сярэдні ўзрост артыстаў — 20 гадоў. Гэта, зразумела, перавага калектыву. Але і працаваць даводзіцца шмат. Класныя заняткі праходзяць штодзённа, нават на гастролях. Нямала ўвагі аддаецца сцэнічнаму майстэрству. У сувязі з новым кірункам у развіцці калектыву яно набыло для нас асаблівае значэнне.

Ансамбль пачынае паказваць сваю святочную праграму і адначасова будзе працаваць над новай. Зноў выступіць у нас у якасці пастаноўшчыкаў далі такія майстры харэаграфіі, як Вольга Князева, Надзежда Усцінава, Вахтанг Уронскі.

ВІНШУЕМ З УЗНАГАРОДАЙ

За заслугі ў развіцці савецкага тэатральнага мастацтва і ў сувязі з шасцідзесяцігоддзем з дня нараджэння народная артыстка Беларускай ССР Жданові-Платонава Ірына Фларыянаўна ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

БЕЛАРУСЬ АРХІТЭКТУРНАЯ

Для галоўнай вуліцы Светлагорска



Ужо зроблена многа прапаноў па будаўніцтву дзевяціпавярховых дамоў. Архітэктары па-рознаму вырашаюць фасады. Адны падкрэсліваюць вертыкалі, каб паказаць стромкі рух угару, часам нават цляняць фасады, дамагаючыся як мага больш стромкіх ліній. Другія айтары імкнуцца падкрэсліць гарызанталі. Адначасова ідзе работа над удасканаленнем унутранай планіроўкі.

Вось яшчэ адна прапанова дзевяціпавярховага дома, якую зрабіў архітэктар «Белдзяржпраекта» Э. Дзямідаў. Такія дамы мяркуецца ставіць у Светлагорску на галоўнай вуліцы, каб зрабіць пэўныя кампазіцыйныя акцэнты. Лёгкія гарызантальныя лініі і лёгкі верхні гарызантальны пояс, які хавае за сабой верхнюю частку ліфтавай гаспадаркі, вентыляцыйныя трубы і інш., здаецца, «здымаюць» грувасткасць дома.

Будаваць дом плануецца з цэглы, аздабляючы светлай пліткай.

Тут будуць створаны ўсе выгоды для жыхароў. На першым паверсе прадугледжаны пакой для захоўвання дзіцячых калясак і веласіпедаў, да паслуг людзей — ліфт. У кватэрах ствараюцца ўсе звычайныя камунальныя выгоды.

На галоўнай вуліцы Светлагорска плануецца паставіць некалькі такіх дамоў. У іх першых паверхах размесцяцца кафэ, цырульня, мэблевы магазін, атэлье па рамонту электрапрыбораў.

Малюнак архітэктара Э. ДЗЯМІДАВА.

КРОКІ ФЕСТЫВАЛЮ

НЕ ТОЛЬКІ ПЕРАД АГЛЯДАМІ

В. НЯМКЕВІЧ,
загадчык аддзела прапаганды і агітацыі Гомельскага абкома КПБ

НАШ КРАЙ багаты таленавітымі людзьмі. Гомельшчына дала пуцёўку ў вялікае мастацтва многім сёння вядомым кампазітарам, мастакам, акцёрам, літаратарам. І рэзервы ў нас сапраўды невычэрпныя. Асабліва прыкметна гэта зараз, калі ўсюды разгарнулася падрыхтоўка да Усесаюзнага фестывалю самадзейнага мастацтва, прысвечанага 50-годдзю Савецкай улады.

У вобласці працуюць 2414 гурткоў мастацкай самадзейнасці — на заводах, у навучальных установах, калгасах, саўгасах, на фабрыках і будоўлях. Колькасць самадзейных калектываў у вёсках будзе расці па меры таго, як будуць будавацца новыя клубы. Такім чынам, колькасць калектываў мастацкай самадзейнасці быццам можа нас задаволіць.

Куды больш складаная праблема — якасны стан яе. Мы можам забяспечыць і новыя і старыя клубы мэбляю, музычнымі інструментамі, радыёпрыёмнікамі, але праблему кадраў сваімі сіламі мы, на жаль, вырашыць не можам. Дзесяцьдванаццаць выпускнікоў культасветвучылішчаў, якія прыязджаюць у вобласць штогод на работу,—гэта сапраўды кропля ў моры. Таму многія гурткі і калектывы мастацкай самадзейнасці ў поўным сэнсе слова з'яўляюцца самадзейнымі, бо працуюць без мастацкага кантролю, без кіраўніка, і трымаюцца на адным энтузіязме саміх удзельнікаў. Не сакрэт, што ў некаторых раёнах ёсць усяго тры-чатыры кваліфікаваныя баяністы, якія па чарзе акампаніруюць на аглядах і хорам, і салістам, і танцавальным калектывам. Падрыхтоўка баяністаў для сельскіх і брыгадных клубаў, якая пачалася з новага навучальнага года ва ўсіх раённых музычных школах, паможа толькі ў нейкай ступені вырашыць праблему кіраўнікоў самадзейнасці, але, безумоўна, не вырашыць яе канчаткова.

Мы ганарымся тым, што ў сельскай гаспадарцы цяпер працуюць людзі з сярэдняй і вышэйшай адукацыяй, што многія калгаснікі вучацца завочна, а ў сельскіх бібліятэках вялікім попытам карыстаецца грамадска-палітычная, мастацкая, спецыяльная літаратура, кнігі пра кіно, музыку, жывапіс, тэатр. І ў той жа час лічыцца нармальным, калі культработнік на вёсцы не мае спецыяльнай адукацыі і ў лепшым выпадку скончыў дзесяцімесячныя курсы пры Доме народнай творчасці. Ці можа такі чалавек справіцца з шырокім колам абавязкаў загадчыка сельскага або брыгаднага клуба, кіраўніка самадзейнасці, з абавязкамі, якія патрабуюць апрача працаздольнасці і стараннасці яшчэ ведаў і таленту?

Даўно ідзе гаворка пра тое, што вобласці неабходна сваё культасветвучылішча або хаця б аддзяленне культурна-асветнай работы пры музычным педагагічным вучылішчы. Але пакуль далей гаворкі справа не ідзе.

Для таго, каб забяспечыць кожную культасветустанову, калектывы мастацкай самадзейнасці высокакваліфікаванымі кіраўнікамі, на наш погляд, неабходна стварыць у рэспубліцы інстытут культуры з вучэбна-кансультацыйнымі пунктамі ў абласных цэнтрах. Толькі пры гэтай умове можна будзе з поўным правам гаварыць пра больш актыўнае развіццё народнай творчасці ў Беларусі.

ФЕСТЫВАЛЬ САМАДЗЕЙНАГА мастацтва і падрыхтоўка да яго ў цэнтры ўвагі не толькі работнікаў культуры, але і ўсіх партыйных і савецкіх арганізацый вобласці. Цяпер ва ўсіх раёнах створаны і працуюць аргкамітэты і аглядавыя камісіі—іх, як правіла, узначальваюць работнікі райкомаў партыі або райвыканкомаў. Вартая пераймання ініцыятыва Ерагінскага райкома партыі, які паставіў перад старшынямі калгасаў і дырэктарамі саўгасаў задачу—стварыць у сваіх гаспадарках хоры і ўважліва кантралюе выкананне гэтага рашэння.

Вядома, адной пастановы мала, каб людзі ўдзельнічалі ў хоры або іншым калектыве самадзейнасці. Арганізатарская і выхаваўчая работа памагае брагінскім культасветработнікам справіцца з гэтай задачай. Актыўна тут працуе раённы Дом культуры. З пачатку года ўдзельнікі мастацкай самадзейнасці Дома культуры па некалькі разоў пабывалі з канцэртамі ў кожным населеным пункце раёна. І гэта важна не толькі таму, што калгаснікі, меліяратары, рабочыя саўгасаў паслухалі добры канцэрт, але і таму, што такія канцэрты з'яўляюцца ў нейкай меры штуршком для развіцця самадзейнасці на месцах. Лепшыя кіраўнікі калектываў Брагіна і Камарына ўжо некалькі год шэфствуюць над сельскай самадзейнасцю. Але галоўнае ўсё-такі ў тым, што кіраўнікі гаспадарак не звальваюць клопаты аб развіцці мастацкай самадзейнасці на загадчыка клуба, а самі ў многім яму памагаюць. Можна прывесці нямала фактаў, калі старшыня калгаса, паргорг, бухгалтар з'яўляюцца актыўнымі ўдзельнікамі самадзейнасці. У вёсцы Ніжнія Жары, напрыклад, вельмі трапна жартуюць: калі хор едзе на агляд, калгас застаецца без кіраўніцтва. Кіруе гэтым хорам на грамадскіх асновах дырэктар Камарынскага Дома культуры С. Хаўкін.

Кожны раён нашай вобласці рыхтуе фестывальныя падарункі да свята. Цікава задумана юбілейная праграма ў Гомельскім раёне: тут ствараецца вялікі зводны хор і танцавальны калектыў, які ў дзень 50-годдзя Савецкай улады выступіць на стадыёне. Новую вакальна-харэаграфічную кампазіцыю рыхтуе старэйшы наш калектыў— народны ансамбль песні і танца Гомельскага Палаца культуры імя Ул. І. Леніна; Азершчынскі, Прыбыткаўскі, Петрыкаўскі народныя хоры ўключылі ў свой рэпертуар новыя песні.

Цяжка пералічыць усе навінкі, якія будуць паказаны на фестывалі. Галоўнае — падрыхтоўка да яго нікога не пакінула абыякавым, нараджае сапраўдную творчую ініцыятыву і раскрыла новыя магчымасці для выяўлення народных талентаў. Заўважу, што ў гэтую работу шырока ўключыліся літаральна ўсе арганізацыі вобласці. Тэлебачанне і абласное радыё пачалі цыкл перадач аб лепшых калектывах мастацкай самадзейнасці, клубах і бібліятэках. Мэта гэтых перадач — прапагандаваць новае і перадавое ў іх рабоце. У парку культуры і адпачынку ствараецца школа масавікоў-забаўнікаў. Архітэктары аблпраекта на грамадскіх асновах афармляюць метадычны кабінет у абласным Доме народнай творчасці. Дзве рэйдавыя брыгады работнікаў культуры і абласнога савета прафсаюзаў на працягу двух тыдняў знаёміліся з падрыхтоўкаю да фестывалю ў раёнах вобласці і праводзілі семінары-практыкумы ў раённых цэнтрах. Акцёры абласнога драматычнага тэатра ўзялі шэфства над 16 самадзейнымі тэатральнымі калектывамі вобласці.

СУР'ЁЗНА І НЕ БЕЗ ПАДСТАЎ занепакоены мы адсутнасцю сучаснага рэпертуару. Кожны калектыў, зразумела, імкнецца да таго, каб стварыць арыгінальную новую праграму, якая б адлюстроўвала слаўны шлях нашай краіны. Але калі пра мінулае ў нас ёсць нямала добрых песень народных і савецкіх кампазітараў, дык навінак пакуль вельмі мала. У Гомелі няма прафесіянальных кампазітараў, таму кіраўнікі вядомых нашых калектываў вымушаны ездзіць па дапамогу ў Мінск. І часта яны вяртаюцца адтуль яшчэ больш занепакоеныя. Справа не ў тым, што нам не хочуць памагчы, проста памагчы пакуль няма чым. Гавораць, новыя песні будуць выдадзены ў канцы года. Але ж у студзені пачынаюцца ўжо агляды.

За час падрыхтоўкі да фестывалю самадзейнага мастацтва ў вобласці створана 35 новых хораў, 20 танцавальных калектываў і 27 аркестраў. Артысты-аматары спрабуюць свае сілы ў тых жанрах, якія да гэтага часу ў нас шырока не папулярызаваліся. Шмат выступленняў зрабіў ужо наш самадзейны цыркавы калектыў. У яго сапраўды святочная, цікавая праграма ў двух аддзяленнях, якая цяпер папаўняецца новымі нумарамі. У Васілевічах створан ансамбль баяністаў.

Усе калектывы — і новыя і старыя—сур'ёзна праэкзаменуе зіма: калі ў клубах будзе няўтульна і холадна, ніякі энтузіязм не паможа. Таму партыйныя, савецкія, грамадскія арганізацыі і раённыя аддзелы культуры аддаюць цяпер вялікую ўвагу падрыхтоўцы культасветустаноў да зімы.

Стварыць новы калектыў мастацкай самадзейнасці нялёгка, яшчэ цяжэй захаваць яго на доўгія гады. У нас ёсць вартыя пераймання прыклады даўгалецця хораў, многія з іх працуюць па дваццаць і больш год — Юравіцкі, Прыбыткаўскі, Азершчынскі і іншыя. Прычына простая і павучальная — увесь час імі кіруюць адны і тыя ж людзі. Стабільнасць кіраўніцтва вызначае творчае аблічча калектыву, яго поспехі. Таму мы стараемся цяпер накіроўваць на работу ў калектывы самадзейнасці людзей сталых, падрыхтаваных і патрабуем, каб ім былі створаны ўмовы.

Трэба прызнаць, што ў горадзе і вобласці ўсё-такі далёка не поўнасцю выкарыстоўваюцца рэзервы развіцця самадзейнасці. У Гомелі ёсць два музычныя вучылішчы і пяць музычных школ, і ні разу ў аглядах не ўдзельнічаў аматарскі сімфанічны аркестр, для стварэння якога ў нас ёсць усе ўмовы — і кваліфікаваныя дырыжоры, і выканаўцы, і цудоўная актавая зала ў музвучылішчы імя Сакалоўскага. Напэўна, цікавай магла б быць праграма маладзёжнага студэнцкага хору— думаю, што навучэнцы тэхнікумаў, студэнты інстытутаў, рабочая моладзь з прыемнасцю займаліся б у ім. Дарэчы, у Гомелі пакуль няма ніводнага сталага харавога калектыву, які спяваў бы ў народнай манеры. Даўно ідзе гаворка пра стварэнне ў адным з раёнаў ансамбля дудароў — і гэтага самабытнага калектыву мы не маем. Мала ў нас цымбальных аркестраў.

Для таго каб не было сезоншчыны ў развіцці мастацкай самадзейнасці, ёй трэба памагаць не толькі перад аглядамі. Такая задача стаіць сёння перад партыйнымі, савецкімі і гаспадарчымі арганізацыямі, органамі культуры вобласці. Паспяхова вырашыць яе можна толькі сумеснымі намаганнямі.

Д. Д. Шастаковіч—Герой Сацыялістычнай Працы

За выдатныя заслугі ў развіцці савецкай музычнай культуры і ў сувязі з 60-годдзем з дня нараджэння Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР кампазітару Дзмітрыю Дзмітрыевічу Шастаковічу прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы з уручэннем яму ордэна Леніна і залатога медаля «Серп і молат».

ТАСС.

З ЗАПІСНОЙ КНІЖКІ ПІСЬМЕННІКА

ГВАРДЫЯ НЕ ЗДАЕЦЦА!

Ул. МЕХАЎ

Спецыяльна паглядзеў у даведнику—адкуль яны паходзяць, гэтыя яркія, як след бліскавіцы, словы? Вычытаў цікавую гісторыю, як цэлае паўстагоддзе пасля славутай бітвы пад Ватэрлоо працягвалі французы спрачацца, хто ж першы са старых напалеонаўскіх ваякаў, аслеплены адданасцю маленькаму карсіканцу, гэтак горда і прыгожа адказаў у той бітве ворагу, стоячы на сваім апошнім рубяжы...

Бог з імі, з напалеонаўскімі ваякамі і іх славалюбівымі нашчадкамі! Не яны ў мяне перад вачыма, калі пішацца ў загаловак артыкула іх агністы покліч. Пра іншых думаю я ветэранаў, пра іншую гвардыю.

1.

Думаю пра Сямёна Мацвееўча Свярдлова.

Снежна-белыя, але па-маладому густыя валасы, асмужаны, трошкі суровы твар, правае вока невідушчае—вечны напамінак пра легендарны Лазоўскі бой, адну з самых вядомых партызанскіх аперацый у Гомельскай вобласці, затое ў левым нібы сілы за абодва: глядзіць, дык, здаецца, працінае— што ты, маўляў, ёсць за чалавек, мой паважаны субяседнік?..

Тут, у Рагачоўскім раёне, Сямён Мацвееўч працаваў перад вайной першым сакратаром райкома партыі. Тут і на гэтай самай пасадзе заставаўся ў час вайны— аж да самага ранення ў красавіку сорак трэцяга.

— Толькі дадалося тады ў назву пасады яшчэ адно слова,— заўважае Сямён Мацвееўч, — «сакратар падпольнага райкома».

У снежні сорак трэцяга, калі на тэрыторыю раёна ступілі часці Савецкай Арміі, прыстаўка «падпольнага» зноў адпала—для Свярдлова пачаліся трудныя будні партыйнага кіраўніка раёна, дзе фронт стаяў яшчэ больш як паўгода; дзе пяць з палавінай тысяч гаспадарак было знішчана ўшчэнт, а ва ўцалелых захавалася 6 свіней, 27 авечак і 278 кароў; дзе вызваленыя з Азарыцкага лагера смерці, пакутвалі ў зямлянках і пры палялішчах чатыры з палавінай тысячы хворых на тыф і трынаццаць тысяч—на малярыю.

Лічбы Сямён Мацвееўч называе цвёрда, без падглядак у блакнот ці запісную кніжку і з дакладнасцю да адзінак. Задужа многа думалася колісь над кожнай з іх, задужа моцна заселі яны ў галаву.

Былі потым пятнаццаць гадоў гаспадарчай работы — дырэктарствавай на спіртзаводзе. А з 1963-га—на пенсіі.

Зрэшты, гэта маё словавызначэнне—«на пенсіі». Сам Свярдлоў яго не ўжывае. Сам ён гаворыць інакш:

— Калі выйду на пенсію,—загнуся...

Гаворыць пераканана, без ценю какецтва.

Тое, як загружаны ў яго кожны дзень і, галоўнае, — чым загружаны,—са словам «пенсіянер» сапраўды не стасуецца. Ні табе рыбацкіх і садова-гародніх радасцей, ні табе пільнай увагі да часопіса «Здоровье». Былы сакратар падпольнага райкома партыі і камісар партызанскай брыгады дзень пры дні зноў на лясных сваіх сцежках, зноў сярод таварышаў суровай і незабыўнай пары. Сярод тых, з кім часам сустракаецца наяве — час пасерабрыў ім, як і яму, галовы, і сярод тых, хто навечна застаўся ў памяці малады і з кім сустрэцца цяпер немагчыма.

Я кажу пра велізарную, вартую самай глыбокай удзячнасці работу Сямёна Мацвееўча па стварэнню ў Рагачове грамадскага краязнаўчага музея. Работу даследчыка і збіральніка.

Пройдуць гады, дзесяцігоддзі, і дакументы, любоўна сабраныя і сістэматызаваныя Свярдловым, стануць каштоўнымі рэліквіямі. Тысячы людзей будуць углядацца ў партрэты народных мсціўцаў, у замалёўкі партызанскага побыту, зробленыя і падараваныя музею колішнім тутэйшым партызанам, зараз вядомым у рэспубліцы мастаком, заслужаным дзеячом мастацтва С. Раманавым, у фатаграфіі Рагачова непаўторных паслярэвалюцыйных гадоў. І хто можа падлічыць, колькі высякуць яны іскраў гонару за родны край, колькі сэрцаў запаляць натхненнем.

Марай пра гэта і жыве цяпер неўтаймаваны чалавек з сівою, па-маладому густою шапкай валасоў, з асмужаным трывожнымі вятрамі нашага палымянага веку тварам.

Штодня ён падымаецца ў музейнае фондасховішча—прасторны пакой пад самым дахам райвыканкома (на другім паверсе—кароткая перадышка: сэрцу ўсё-такі за шэсцьдзесят), каб папоўніць альбомы з фотаздымкамі, перагаварыць з мастаком ці столярам, памагчы студэнтам-завочнікам, што пішуць курсавыя работы на тэмы гісторыі роднага краю. Штодня ён і сам садзіцца за пісьмовы стол —не закончаны яшчэ падрабязны дапаможнік для будучых экскурсаводаў музея («Атрымаем жа мы калі-небудзь памяшканне, дзе можна будзе па-сапраўднаму разгарнуць экспазіцыю!»); ёсць пытанні да земляка, што жыве цяпер далёка, але адразу ж адгукнуўся на просьбу прысласць успаміны пра Рагачоў у грамадзянскую вайну («Уяўляеце, колькі радасці старому пераканацца, што пра яго не забылі на радзіме...»); трэба паслаць напамінак у Мінск—райком і вобласць падтрымалі ідэю аб стварэнні ў Рагачове на базе сабраных Свярдловым матэрыялаў («А колькі іх у нас яшчэ не выяўлена!..») філіяла абласнога музея, але Міністэрства культуры ў адказ нешта вады ў рот набрала...

У мяне ў галаве мільгае: пенсіянер? Не падобна. Да пенсіі яму яшчэ ўга як далёка!

2.

Думаю пра Карпа Міхайлавіча Драчова.

У гэтага яны ёсць—і рыбацкія, і грыбныя, і садова-гародніх клопаты. Нават захапленні.

Калі я прыйшоў, ён перш-наперш паставіў перада мною талерку з вінаградам. Гронкі былі матава-свежыя, у магазіне такія не ўбачыш.

— Свой?—пытаюся я.

— Свой,—адказвае Карп Міхайлавіч. Адказвае трошкі з гонарам.

Кідаю вокам праз акно — за надворнымі будынкамі відзён заталісты, узорна дагледжаны сад. Такім, бясспрэчна, можна ганарыцца. Але колькі тут з вясны да восені трэба пазавіхацца! З павагай гляджу на рукі гаспадара— бурыя, вузлаватыя рукі працаўніка.

Расказваю Карпу Міхайлавічу, што заходзіў раней, але не застаў яго дома, жонка сказала, што ён пайшоў у райком. Я падаўся ў райком, але і там не застаў—Драчоў, сказалі райкомаўцы, ужо ў гарсавеце.

— У гарсавеце таксама наўрад ці засталі б,—усміхаецца Драчоў.—Забег туды ненадоўга, спяшаўся па дэпутацкіх справах...

(Заканчэнне на 2-й стар.).

Чалавек — тэхніка — прыгажосць

ЗА ШЭРАСЦЬ — НЕ Б'ЮЦЬ

Вы прыходзіце ў магазін. Вам трэба выбраць нейкі посуд, каб на свята прыняць гасцей. Вы бачыце ў вітрыне нешта больш-менш прыдатнае. «Ну, думаеце вы, можна, калі няма нічога іншага, пагадзіцца і з гэтым». Але раптам на гэтай жа вітрыне заўважаеце таблічку «Будзе асвоена». Значыць, усяго гэтага яшчэ няма, і чакаць давядзецца пакуль гэта асвояць... Можа прайсці не толькі многа месяцаў, але і многа гадоў. Словам, чакаць паабяцаныя ўзоры — гэта ўсё роўна, што шукаць пазалеташні снег. А што ж ёсць у продажы? Хочацца набыць нешта свежае, цікавае, прыгожае.

Але такога нічога няма. Усё старых форм, з непрыгожымі старымі малюнкамі, яно было, здаецца, і тады, калі жыла бабуля... Чаму так у нас здараецца? Чаму ў нас тое-сёе ёсць на вітрынах, а яшчэ больш у музеях, на выстаўках, і так мала арыгінальнага ў магазінах? Чаму не зрабіць выставачныя рэчы масавай з'явай, здабыткам усіх?

Мне здаецца, адна з прычын, што выдатныя ўзоры, распрацаваныя мастакамі, не ідуць у вытворчасць, тое, што яны сустракаюць на сваім шляху магутны заслон прыхільнікаў шэрасці і прымітыву. Адразу агаваруся. Ніхто прама і проста не прапаведуе шэрасць, усе на словах стаяць за высокамастацкія ўзоры, але ж, бачыце, існуе яшчэ тэхналогія вытворчасці, рэч аб'ектыўная, рэч, можна сказаць, святая і, крый божа, каб што ў ёй было парушана! Вось з гэтага і вынікаюць часцей за ўсё розныя беды, і яна, гэтая тэхналогія, з'яўляецца часцей за ўсё тым шчытом, за якім хаваюцца прыхільнікі прымітыву і шэрасці.

Я не павяду чытача на розныя фабрыкі, каб расказаць пра гэтых людзей. Я раскажу пра тое, як працуе адзін з мастацкіх саветаў, які разглядае і дае сваё «добра» пэўным узорам.

Пры міністэрствах існуюць мастацкія саветы. Яны рэкамендуюць прадпрыемствам выпускаць пэўныя рэчы. У склад савета ўваходзяць мастакі, работнікі адпаведнага міністэрства, гандлю, вытворчасці. І вось часам здараецца так, што іменна гэтыя саветы, якія павінны клапаціцца пра тое, каб заводы рабілі высокамастацкія рэчы, становяцца ўпоперак шляху, перашкаджаюць іх укараненню. А ўсё з-за таго, што тут знаходзяцца людзі, якім выгадна не змяняць тэхналогію, не браць на сябе лішніх турбот.

Часам гэтыя людзі накіроўваюць работу саветаў не заўсёды ў адпаведнасці з іх прызначэннем. Членам савета — мастакам — у гэтым выпадку вельмі цяжка адстаяць той ці іншы ўзор, каб запусціць яго ў вытворчасць. Іншы раз старшыня савета (як правіла, гэта намеснік міністра) не жадае лічыцца з думкамі членаў савета, выкарыстоўвае службовае становішча, адстойваючы прывычнае, праверанае, хоць і безнадзейна ўстарэлае. І такім чынам атрымліваецца, што на шляху да новага становяцца людзі, якія павінны былі б самі быць у першых радах барацьбы за яго.

Гэта не галаслоўныя сцвярджэнні. Раскажу пра адно з пасяджэнняў мастацкага савета прамысловасці будаўнічых матэрыялаў, якое адбылося не так даўно. На ім зацвярджаліся ўзоры мастацкіх сувеніраў, прысвечаных п я ц ідзесяцігоддзю Вялікага Кастрычніка.

Савет разгледзеў і рэкамендаваў для вытворчасці нямала цікавых, сапраўды в ы с о к амастацкіх узораў шклозавода «Нёман». Яны разнастайныя. Большасць іх вылучаецца мастацкай завершанасцю, вобразнасцю.

Цікавыя вырабы прадставіў шклозавод імя Ф. Э. Дзяржынскага, Мінскі фарфоравы завод. Многія з узораў апошняга былі ўхвалены маскоўскай камісіяй для паказу на сусветнай выстаўцы ў Манрэалі.

Многа добрага на гэтым савеце было рэкамендавана для вытворчасці. Іншая справа, калі ўсё гэта вытворчасць здолее асвоіць. Але гэтыя ўзоры сталі, калі можна так сказаць, законнымі, і, магчыма, некаторыя з іх будуць і выпускацца. Аднак мастацкі савет не быў паслядоўным у адборы ўзораў. Непрыглядна паводзіў сябе прадстаўнік Міністэрства прамысловасці будаўнічых матэрыялаў Б. Дземідовіч.

На разгляд савета былі прадстаўлены Мінскім фарфоравым заводам цукерніца і дэкаратыўнае блюда (камплект). Мастак цікава вырашыў форму. Арнаментальны роспіс па народных матывах надае вырабу нацыянальны характар. Аднак, мастак «пасмеў» адступіць ад «традыцый»! Замест звыклай простай лініі ён прапанаваў прыгожы выгіб. Гэта, зразумела, больш складана для вытворчасці, але рэч стала свежай, арыгінальнай.

І вось прадстаўніка міністэрства напалохала нязвыклае. І ён на працягу дзвюх гадзін спрабаваў абвергнуць адзінадушную думку савета, які прапанаваў выдаць рэч невялікім тыражом. Б. Дземідовіч даводзіў, што ўзор нетэхналагічны. І ён прымяніў усё — і спасылаўся на тое, што, маўляў, узор не разгледжаны рабочай камісіяй (дарэчы, ні адзін іншы выраб з прадстаўленых на савет, гэтай камісіяй не разглядаўся, хоць многія былі і зацверджаны, да таго ж у камісію ўваходзяць тыя ж людзі, што і ў склад гэтага мастацкага савета), спрабаваў пазбавіць асобных членаў савета слова, прапаноўваў разгледзець выраб на наступным пасяджэнні пасля тэхналагічнага даследавання (на што спатрэбіцца пяць-шэсць месяцаў). Гэта, фактычна, азначала, што ўзор не будзе запушчаны ў вытворчасць да юбілею Вялікага Кастрычніка.

Уся гэта гісторыя здаецца, мякка кажучы, крыху дзіўнай. Савет, у склад якога ўваходзяць галоўныя мастакі прадпрыемстваў, вядучыя майстры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва рэспублікі, мастацтвазнаўцы, работнікі гандлю, угаворвае прадстаўніка міністэрства (свайго старшыню) і галоўнага інжынера фарфоравага завода выпускаць прыгожыя мастацкія рэчы, а тыя не жадаюць. Парадаксальная з'ява!

Але дзівіцца тут асабліва няма чаму. І міністэрства, і кіраўнікі завода імкнуцца толькі «гнаць вал», рабіць тое, што больш простае, лёгкае і звыклае па тэхналогіі. І адказнасці табе ніякай, і план выкананы. А за шэрасць жа ніколі яшчэ не білі...

Трэба сказаць, што гэта не адзіны выпадак, калі старшыня мастацкага савета і кіраўнікі прадпрыемстваў дабіваюцца адхілення добрых высокамастацкіх узораў. Так не раз здаралася і пры разглядзе прадукцыі шклозаводаў «Нёман» і імя Ф. Э. Дзяржынскага. Гэта назіралася і пры зацвярджэнні некаторых сувеніраў Мінскага фарфоравага завода. І цікава тое, што іменна гэтыя вырабы, супраць якіх выступалі кіраўнікі савета, экспанаваліся ў Маскве і атрымалі там высокую ацэнку, многія з іх адабраны для паказу ў савецкім павільёне на Сусветнай выстаўцы ў Манрэалі.

Праходзяць гады. З цяжкасцю прабіваюцца праз мастацкі савет добрыя рэчы, якія потым прызнае ўвесь свет. Але гэтыя сумныя ўрокі нічому не вучаць тых, хто вырашае лёс узора. І сёння Міністэрства прамысловасці будаўнічых матэрыялаў робіць націск на членаў мастацкага савета, патрабуючы, каб зацвярджаліся для вытворчасці рэчы гранічна простыя па сваёй тэхналогіі. Гэта з цягам часу прыводзіць да таго, што ўзоры трацяць свае мастацкія якасці, у вытворчасць не запускаецца нешта новае, свежае і арыгінальнае. Гэтая з'ява мае і іншы адмоўны бок. Завод, які спецыялізуецца на выпуску, груба кажучы, прымітываў, паступова прыходзіць да таго, што толькі і можа выпускаць такія прымітывы. Майстры дысквалфікуюцца. Ужо сёння, для таго каб зрабіць якую-небудзь больш-менш складаную рэч, даводзіцца звяртацца да пенсіянераў, старых майстроў. Заводу гэта, зразумела, толькі перашкода. А вучыць моладзь чаму-небудзь складанаму тут не жадаюць. Міністэрства патурае такому становішчу. Так зачараванае кола замыкаецца, адсюль і той вынік, які мы бачым у магазінах. Прадстаўнікі міністэрства і прадпрыемстваў выступаюць на мастацкіх саветах супроць цікавых складаных мастацкіх узораў, прымаюць больш-менш простае. Але ўжо і гэтыя простыя рэчы сёння часам «не па зубах» вытворчасці, якая ў пагоні за валам дысквалфікуецца. Таму так марудна асвойваюцца ўзоры, выстаўленыя ў вітрынах магазінаў, найчасцей яны нават і не асвойваюцца...

Трэба разарваць гэтае зачараванае кола. Трэба пачаць хоць з самага малога, што ў нашых магчымасцях.

Мастакі і гандлёвыя работнікі на мастацкім савеце прыйшлі да адзінадушнага выводу, што неабходна выпускаць хаця б невялікімі тыражамі высокамастацкія падарункавыя вырабы. Яны неабходныя асабліва к юбілейным і святочным датам, калі сталіцу наведвае многа гасцей з саюзных рэспублік і з-за мяжы. Што мы ім дорым? Шклянку альбо стары сервіз, якія нават самыя непатрабавальныя пакупнікі не бяруць.

А між тым невялікія тыражы высокамастацкіх (хай сабе «эксперыментальных») вырабаў — 50—100 экземпляраў — маглі б выпускаць і мастацка-эксперыментальныя лабараторыі заводаў, якія неабходна належным чынам абсталяваць і ўкамплектаваць адпаведнымі работнікамі. Работнікі гандлю лічаць, што такія вырабы можна было б прадаваць па часовых цэнах. Такім чынам, эксперыментальныя лабараторыі апраўдалі б сябе і з эканамічнага боку.

Наспеў час, каб мастацкім саветам кіравалі кваліфікавана, адмовіўшыся ад адміністравання і валявога націску. Рашэнне мастацкага савета павінна быць законам для прадпрыемства.

Ф. ВАЛАДЗЬКО,
мастацтвазнаўца.

Добрыя танцоры на «Гомсельмашы»!

Фото Л. ЛЯВОНЕНКІ.

ІРЫНЕ ФЛАРЫЯНАЎНЕ ЖДАНОВІЧ — 60 ГОД

ДАБРАТА ДУМАК І ПАЧУЦЦЯЎ

Жыццё і творчасць народнай артысткі БССР Ірыны Фларыянаўны Ждановіч звязана з тэатрам імя Янкі Купалы з першых дзён яго заснавання. Яна выхоўвалася ў тэатры, расла разам з тэатрам, тут расцвіла яе непаўторная творчая індывідуальнасць, юнацкі запал узбагаціўся жыццёвай мудрасцю, сцэнічнай культурай, глыбокім веданнем праяў чалавечай душы.

Творчае развіццё Ірыны Ждановіч было арганічным, цэласным і мэтанакіраваным. Яна выступала ў розных ролях, вельмі непадобных адна на адну, стварыла галерэю незабыўных вобразаў, кожны з якіх заслугоўвае разгляду і вывучэння. Артыстка жыла на сцэне, падпарадкоўваючыся законам ансамбля і задачам спектакля, нідзе не выстаўляла і не падкрэслівала сваё асабістае, і тым не менш у кожным вобразе захоўвала нешта сваё, непаўторнае. Крыніца жыццёвых фарбаў, адценняў і душэўных рухаў у Ждановіч была невычэрпная. Яна востра адчувала мяжу паміж праўдзівасцю і фальшам, позай і натуральнасцю, і нідзе не пераступала гэтай мяжы. Адсюль — кантакт з гледачом, давер'е гледача. Перад намі нібы раскрываўся чалавек, і многае такое, што не кожны можа заўважыць у Чалавеку, станавілася ясным і зразумелым.

Калі мы называем тэатр школай жыцця, дык Ірына Ждановіч была ў гэтай школе адной з лепшых настаўніц.

Мы любім і паважаем Ірыну Фларыянаўну за яе творчую шчодрасць, высакароднасць думак і пачуццяў, за дабрату душы, харошае сэрца.

Выдатная актрыса, рэжысёр і педагог, яна дае нам бліскучы прыклад натхнёнай працы, заўсёднага творчага гарэння, вернасці свайму народу і той вялікай справе выхавання яго, якой аддае яна сваё шчодрае сэрца.

Добрага Вам здароўя, Ірына Фларыянаўна! Жывіце доўга ў радасці і шчасці!

Ю. ГАЎРУК.

СВАЯ ПЕСНЯ

Некалькі гадоў назад Ірына Фларыянаўна Ждановіч, якой сёння спаўняецца шэсцьдзесят, пакінула сцэну. І, мабыць, назаўсёды. У тэатр прыйшлі іншыя артысткі, маладзейшыя. Але слава актрысы не паблякла, яна будзе жыць доўга.

Помню дні і гады, калі ўсе мы хадзілі ў тэатр «на Ждановіч». І нам тады не асабліва было важна, якая ішла п'еса, пра што яна, хто яшчэ з акцёраў удзельнічае ў спектаклі. Важна было, каб у гэты вечар іграла Ждановіч. Ведалі, што яна падорыць нам шчаслівыя хвіліны. І яна шчодра дарыла іх...

Шчаслівыя, радасныя хвіліны! Не, яны ніколі не выветрацца з памяці. Як цяпер, бачу натхнёны твар артысткі, вялікія, шырока адкрытыя вочы, у якіх месяцца цэлы свет. У іх можна было чытаць усё: радасць і скруху, шчасце і пакуты, вялікі боль, гнеў, замілаванне. Мусіць, ніколі гэтыя вочы не былі пустыя.

Жывуць у памяці жэсты Ждановіч, скупыя, лаканічныя, нешматслоўныя. Часам адзін толькі крок на сцэне — гэта ўжо выбух, а часам у маўклівай, нерухомай фігуры немым крыкам крычыць усё: вочы, рукі, сэрца...

Той, хто бачыў Ждановіч у ролі Норы, напэўна, памятае сцэну, калі гераіня раптоўна зразумела ўсю нікчэмнасць чалавека, для якога гатова была ахвяраваць усім на свеце. Вось яна, Нора, як скамянелая, сядзіць у глыбіні сцэны, сядзіць моўчкі доўга-доўга, але роспачна крычыць уся яе маўклівая постаць. Не забыць і позірку Людмілы, такога красамоўнага, у «Познім каханні», калі яна, праходзячы праз пакой, бачыць раптам Мікалая з Лябёдкінай.

І яшчэ — непаўторны голас Ждановіч. Здаецца, заплюшчыў бы вочы і бясконца слухаў яго. Гнуткі, унутрана ўсхваляваны, гучны, як туга напятая струна...

Мне даводзілася бачыць на сцэне шмат славутых савецкіх і зарубежных актрыс. Параўнаць кагонебудзь са Ждановіч цяжка. Яе талент глыбока самабытны. Яго можна параўнаць хіба з песняй, якую, раз пачуўшы, ужо не забудзеш.

Ждановіч мы пазнавалі ў любым абліччы, з першага слова, з першага кроку. Здавалася, яна знарок ігнаравала вонкавую характарнасць, каб усю ўвагу гледача скіраваць углыб, на раскрыццё душэўнага багацця вобраза.

Гераіні Ждановіч узніміліся над побытам, над штодзённасцю. Узніміліся на крылах мары, якія і нас, першакурснікаў, неслі тады далёка-далёка ў рамантычную нязведаную далеч.

Ірына Ждановіч нібы пасяляла гераінь у свой асабісты свет, непаўторны і чысты, у сваю краіну паэзіі. І вобразы раптам пачыналі зяяць асаблівым, дзівосным святлом.

Так было з роллю Ані Крушыны ў «Канстанціне Заслонаве», роллю эпізадычнай, якая ў спектаклях іншых тэатраў глядзелася проста як прахадная, а ў выкананні Ждановіч у купалаўскім тэатры стала адной з самых яркіх. Так было і ў многіх іншых ролях, якія іграла Ірына Фларыянаўна.

Ждановіч — актрыса глыбокай псіхалагічнай праўды. Амаль не клапоцячыся пра вонкавае перавасабленне, яна ўсе сілы таленту аддавала пранікненню ў глыбіні душы персанажаў, дакапваючыся аж да самых патаемных яе закуткаў. І тут не было дробязнасці, хоць артыстка паказвала падрабязнасці, найтанчэйшыя зрухі ў псіхалогіі. Мо таму і вобразы, створаныя Ждановіч, заўсёды жылі ў трохмернай прасторы, ні на хвіліну не заставаліся статычнымі. За кейкія тры-чатыры гадзіны, пакуль ішоў спектакль, гераіні Ждановіч паспявалі пражыць на сцэне цэлае жыццё. А калі і не поўнае жыццё, то яго кульмінацыйныя вяршыні. Ці не таму гераінь Ждановіч мы заўсёды заставалі на пераломе характару. Літаральна на нашых вачах цярпела адно крушэнне за другім яе Верачка з «Апошніх». Зусім яшчэ нявопытная, неспакушаная ў пачатку спектакля, Вера ў фінале станавілася маленькай бабулькай, зламаной душэўна і знявечанай фізічна.

І ўсё ж артыстка больш любіла сустрэчы з гераінямі, якія сталелі ў барацьбе. Яна іграла іх выдатна, з уздымам, захапляючыся самім працэсам жыцця вобраза.

Артыстка выдатна паказвала сваіх гераінь у пераломныя моманты іх жыцця.

У душы дзяўчынкі-падлетка з п'есы Афінагенава «Машанька» адбываліся вялікія змены. Дзіця станавілася дарослым чалавекам, з падлетка вырастала дзяўчына. Машанька ў Ждановіч сталела, спакваля набываючы рысы і якасці дарослага чалавека, і ўвесь гэты складаны працэс адбываўся на вачах гледачоў.

З вясёлай бесклапотнай дзяўчынкі Джульеты таксама на нашых вачах вырастала мудрая сэрцам, адважная і рашучая жанчына. Прыходзіла сталасць, і назаўсёды адыходзіла ў нябыт колішняя дзіцячая кволасць. З'яўлялася ўпэўненасць, сіла волі і сіла духу чалавека, які здольны пастаяць за сябе і свайго каханага.

Марылька з «Бацькаўшчыны» таксама ўвачавідкі мянялася, духоўна расла, загартоўвалася і мужнела. І ўсё гэта зноў жа адбывалася на працягу спектакля.

Перад намі ўсюды праходзіў працэс станаўлення асобы чалавека.

Можна назваць шматлікія ролі з рэпертуару Ірыны Фларыянаўны Ждановіч, у якіх гэты працэс прасочваўся актрысаю з надзвычайнай увагай і пільнасцю. Прыкладаў будзе вельмі многа — цэлая галерэя вобразаў, людзей, якія ў працэсе барацьбы змяняліся настолькі, што рабіліся зусім іншымі, непадобнымі на тых, каго мы бачылі ў пачатку спектакля.

Артыстаў звычайна хваляць за багацце рэпертуару. У Ждановіч ён сапраўды шырокі і разнастайны. Драма, трагедыя, камедыя — ва ўсіх гэтых жанрах актрыса дасягала поспеху. Гераіні нашага сёння і нядаўняга мінулага, людзі далёкіх эпох, жанчыны з рознымі характарамі, прадстаўніцы розных сацыяльных груп — цэлая галерэя вобразаў... Але шырыня рэпертуару артыста і яго творчы дыяпазон — гэта не адно і тое ж.

Найчасцей Ірына Ждановіч іграла ролі лірыка-драматычнага плана. Але талент яе яўна не ўмяшчаўся ў рамкі гэтага амплуа. І тады мы рабіліся сведкамі, як нават у самых «блакітных» ролях успыхваў у яе магутны тэмперамент. У гэтым святле ярка паўставала перад намі жыццё Людмілы з «Позняга кахання», Негінай з «Талентаў і паклоннікаў».

Актрыса сыграла шмат роляў, у тым ліку ў беларускіх п'есах. Многія з гэтых роляў прынеслі сапраўднае шчасце артыстцы і нам, гледачам. Напэўна таму, што ў Ждановіч быў свой адметны голас, свая ўласная песня ў тэатры...

Па ролях, якія іграе артыст, нярэдка вызначаюць не толькі яго схільнасці, але і магчымасці. Мне здаецца, што патэнцыяльна Ждановіч актрыса трагедыйная. Сцвярджаць гэта, праўда, як быццам няма відавочных падстаў. За сорак гадоў, пражытых на сцэне, артыстка сыграла ўсяго толькі Джульету, Даларэс у «Фландрыі». Бадай і ўсё. Надзвычай мала для творчай характарыстыкі трагедыйнай актрысы, бо урэшце гэтыя ролі маглі сыграць і іграюць выканаўцы іншага дарання, у прыватнасці, лірычнага. І ўсё ж Ждановіч — трагедыйная актрыса, актрыса надзвычай рэдкага цяпер амплуа ў тэатры. Той, хто бачыў яе на сцэне ў самых розных ролях, мабыць, пагодзіцца са мной. Усплёскі магутнага трагедыйнага таленту былі амаль у кожнай яе сцэнічнай рабоце, усюды, дзе толькі гэтаму большменш спрыялі абставіны ролі, падзеі. І яны, гэтыя моманты высокага трагедыйнага ўзлёту, глыбока хвалявалі, узрушалі нас. На спектаклях з удзелам Ждановіч мы часта перажывалі духоўнае ачышчэнне, тое, што старажытныя грэкі называлі катарсісам.

І не віна Ждановіч, што яна гэтак мала сыграла трагедыйных роляў. У той час, калі яна была ў поўным росквіце духоўных і фізічных сіл, трагедыя амаль не паяўлялася на сцэне, як, дарэчы, не часта з'яўляецца яна і цяпер. А мроіліся ж ролі Жаны д'Арк, Лаўрэнсіі, Кацярыны з «Навальніцы». Яны патрэбны былі не толькі актрысе і яе гледачам. Славутыя ролі сусветнага рэпертуару маглі б не толькі ўзбагаціць выканаўцу. Такая актрыса, як Ждановіч, магла б узбагаціць і наша ўяўленне аб гэтых гераінях, так, як пашырыла яна ўяўленне аб свеце Шэкспіра, стварыўшы сваю Джульету.

Цяпер можна толькі шкадаваць аб тым, што не збылося, не здзейснілася... Відаць, ні адзін біёграф нашых буйнейшых нацыянальных артыстаў будзе яшчэ шкадаваць, што выдатны талент, бліскучае майстэрства нашых карыфеяў сцэны мала, або зусім не выпрабоўвалася на ролях вялікага маштабу. А акцёры ж мінулага заваёўвалі сабе славу, усеагульнае прызнанне менавіта на такіх вось ролях. Яны выбіралі для сябе рэпертуар, для іх ставіліся спектаклі. А нашы ж выдатныя майстры маглі б дадаць намнога больш старонак у вельмі багатыя сцэнічныя біяграфіі самых складаных роляў сусветнай драматургіі...

Гады робяць сваю справу. З гадамі лягчэй азірацца назад, лягчэй ацэньваць тую ці іншую мастацкую з'яву, лягчэй канстатаваць пралікі. Хацелася б толькі, каб тая сцежка, якую пратаптала Ждановіч, ніколі не дзірванела...

Гады бяссільныя, калі яны не могуць сцерці следу на зямлі, які пакінуў творца. На долю Ждановіч выпаў шчаслівы лёс быць адной з самых яркіх зорак на нашым беларускім тэатральным небасхіле, сярод многіх выдатных нацыянальных актрыс стаць першай, такой, як у Расіі — Ярмолава, на Украіне — Занькавецкая, у Латвіі — Ліліта Берзінь...

Песня ўрэшце можа заціхнуць, але гукі яе чароўнай мелодыі ўсё адно застаюцца ў сэрцы, салодка трывожаць памяць, будзяць, ускалыхваюць душу. Дык хай гэта песня кліча ў дарогу новыя, маладыя сілы.

Анатоль САБАЛЕЎСКІ.

ЭНТУЗІЯСТ

Гартаю старонкі вучнёўскіх сшыткаў. Гэта не сачыненні школьнікаў. Гэта рабочыя запісы сельскага кінамеханіка за васемнаццаць гадоў яго работы ў вёсцы Тамашоўцы.

Чытаю лаканічныя запісы і, здаецца, нібы знаёмлюся з поступам нашай кінафікацыі за пасляваенны час. Як трэба любіць сваю работу, сваю прафесію, каб штодзённа занатоўваць вынікі рабочага дня, запісваць тое, што не прадугледжана ніякімі інструкцыямі, але што можа прынесці карысць і сабе і таварышам па рабоце.

Галоўным у сваёй рабоце кінамеханік Іван Мельнічук лічыць цесную сувязь з людзьмі, для якіх з такім стараннем паказвае фільмы. Іван Дзям'янавіч ведае іх запатрабаванні, заўсёды імкнецца выканаць заяўкі на карціны.

Іван Дзям'янавіч шмат клапоціцца аб прапагандзе фільмаў. Ён не сядзіць склаўшы рукі і не чакае, пакуль людзі збяруцца ў клуб. У дні паказу лепшых фільмаў кінамеханіка сустрэнеш у полі, на ферме, у школе, сельсавеце, магазіне, у дамах калгаснікаў. Ён раскажа пра новую карціну, запросіць у клуб.

Праўда, не заўсёды кінамеханіку спадарожнічае поспех, бо за апошнія гады на экраны выходзіць нямала шэрых кінастужак.

— Часта сталі трапляць на стацыянар нецікавыя фільмы, — з крыўдай гаворыць Іван Дзям'янавіч. — Вельмі цяжка іх паказваць людзям, якія заўсёды чакаюць ад цябе толькі добрыя карціны. А хваліць гледачам дрэнныя фільмы я не магу. І людзі гэта адразу адчуваюць, не ходзяць на сеансы, а гэта пагроза плану. У такіх выпадках даводзіцца самому звяртацца ў кінапракат і прасіць, каб прыслалі лепшыя стужкі, хоць бы нават і выпуску мінулых гадоў. Яны ў нас ніколі не старэюць. Неаднойчы выручалі фільмы аб Леніне, «Чапаеў», «Аляксандр Пархоменка», трылогія пра Максіма, «Дэпутат Балтыкі» і многія іншыя, якія ўвайшлі ў залаты фонд савецкай кінематаграфіі.

Многае змянілася ў Тамашоўцы за пасляваенныя гады. Вырасла новае пакаленне гледачоў. Людзі жывуць лепш, весялей, узраслі іх культурныя запатрабаванні. Кінамеханіка хвалявала, што многія актыўныя гледачы сталі купляць тэлевізары. Да яго звярталіся аднавяскоўцы, каб параіў, які тэлевізар лепш купіць, запрашалі ўстанавіць антэну, наладзіць прыёмнік. Іван Дзям'янавіч дапамагаў людзям, але тут жа гаварыў аб перавагах кінематографа і запрашаў у клуб паглядзець каляровую карціну, якую па тэлевізары не ўбачыш. Іван Дзям'янавіч сам устанавіў у Тамашоўцы шырокі экран, і гледачы па-ранейшаму ахвотна наведваюць свой сельскі кінатэатр.

Больш трох гадоў узначальвае Іван Дзям'янавіч брыгаду сельскіх кінамеханікаў. Ён ахвотна перадае членам брыгады свой вопыт. Маленькі калектыў працуе дружна. Усе кінаўстаноўкі брыгады паспяхова выконваюць план.

Любіць Іван Дзям'янавіч сваю работу. Гэта адразу заўважаеш, калі зойдзеш да яго ў апаратную. Усё тут на сваім месцы, апаратура добра адрэгулявана, чыстая. Кінамеханік шмат чытае, удасканальвае якасць паказу.

Сваю любоў да кінематографа Іван Дзям'янавіч перадаў старшаму сыну Васілю. Вось ужо больш года, як яны працуюць разам. Сёлета Васіль вучыцца ў дзесятым класе, адначасова рыхтуецца стаць кінамеханікам другой катэгорыі.

— Пасля заканчэння сярэдняй школы, — марыць Васіль, — буду паступаць у кінаінстытут, хачу стаць кінаінжынерам.

Р. ЖУК.

Брэсцкі раён.

ГВАРДЫЯ НЕ ЗДАЕЦЦА!

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

Спяшацца Карпу Міхайлавічу даводзіцца часцяком. Як ні кажы, намеснік старшыні выканкома гарсавета на грамадскіх асновах («Апроч розных пасяджэнняў, штотыднёва маю прыёмны дзень...»), старшыня парткамісіі райкома («Зноў пасяджэнні, зноў прыёмныя дні. А персанальныя справы — ведаеце, што гэта такое?..»), член савета райсабеса, член партбюро сваёй, гарвыканкомаўскай, партарганізацыі, член савета музея — а гэта ж яшчэ не ўсё, гэта толькі асноўныя даручэнні і абавязкі.

— Досыць, мабыць, для чалавека, які неўзабаве размяняе восьмы дзесятак, — зноў усміхаецца Карп Міхайлавіч.

— Вам семдзесят? — шчыра дзіўлюся я. — Ды з выгляду вам хіба што пяцьдзесят з невялікім гакам!

— Эге, пяцьдзесят! Пяцьдзесят гадоў назад я быў ужо салдат. Ужо на першай сваёй вайне — мікалаеўскай — у акопах марнеў. А ўсяго было іх у маім жыцці чатыры — імперыялістычная, грамадзянская, паход у Заходнюю Беларусь у трыццаць дзевятым, ну і, вядома, Айчынная.

У Айчынную вайну, як і Свярдлоў, быў Карп Міхайлавіч тут, у Рагачоўскім раёне. Загадчык райза стаў баявым партызанскім камандзірам, аўтарытэтным членам бюро падпольнага райкома. Партызаніў з першага і да апошняга дня акупацыі раёна фашыстамі. Выйшаў з лесу старшынёй райвыканкома.

Карп Міхайлавіч кладзе на стол альбом з фатаграфіямі. З дарагімі яму здымкамі часоў партызанства і пазнейшымі, зробленымі нядаўна, на злётах і сустрэчах колішніх баявых таварышаў. Памажнелі, пасівелі, узброіліся акулярамі хвацкія лясныя салдаты. А дарогамі іх маладосці ходзіць сёння іншая маладосць — ходзіць з поўнымі агню вачыма, з пачуццём трапяткой павагі ў сэрцах.

Карп Міхайлавіч паказвае фатаграфіі мемарыяльных абеліскаў, пастаўленых на месцах, што сталі ў раёне святынямі. Да гэтых абеліскаў ён часта водзіць атрады юных следапытаў, піянераў і камсамольцаў.

Строгія, тактоўна і з густам зробленыя стэлы. Лаканічны тэкст:

«Тут у перыяд Вялікай Айчыннай вайны 15 жніўня 1941 года праведзена першае пасяджэнне Рагачоўскага падпольнага райкома КПБ. Створан першы рагачоўскі партызанскі атрад»:

«Тут, у Сялецкай школе, у перыяд Вялікай Айчыннай вайны ў глыбокім тыле ворага 1 лютага 1943 года адбылася падпольная канферэнцыя Рагачоўскай раённай арганізацыі Камуністычнай партыі Беларусі».

«У гэтым Каменскім лесе ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны 27 красавіка 1943 года партызанскі атрад імя Варашылава правёў вялікі 14-гадзінны бой з пераважнымі сіламі акупантаў. Варашылаўцы нанеслі ворагу вялікія страты, выйшлі пераможцамі».

Цікаўлюся, адкуль бралі сродкі на гэтыя цудоўныя абеліскі — яны ж, відно, не дужа танныя.

— Частку сабралі сярод грамадскасці, а частку... — Драчоў на момант змаўкае і хітравата мне падміргвае. — Замяняў я летась нейкі час старшыню гарвыканкома. Дык мы махнулі за кошт бюджэта. Вядома, так нам гэта не сышло, наківалі трохі зверху — парушэнне фінансавай дысцыпліны ўсё-такі. Давялося праглынуць, павініцца, але помнікі — стаяць!

...Няўжо яму сапраўды семдзесят?..

3.

Думаю пра Сцяпана Піліпавіча Змушко.

Думаю пра схему і стандарт некаторых п'ес і раманаў, дзе з новым — абавязкова моладзь, са старым — людзі, у якіх маладосць за плячыма. А ў жыцці...

Гадоў восем-дзевяць назад, калі Сцяпан Піліпавіч яшчэ не выйшаў на пенсію і быў у Рагачове першым сакратаром райкома партыі, пра сельскія камітэты — гэтую новую форму грамадскай работы на вёсцы — не было яшчэ нічога чутно. Селькомы — рух самага апошняга часу. Але хай хто з маладых так адчуе іх магчымасці і перспектывы, як адчувае пенсіянер Змушко!

— Сельсаветы, вы ж ведаеце, цяпер узбуйнены, клопатаў шмат, да ўсяго аніяк не дойдуць. А ў селькома — калі, вядома, не лайдакі ў ім сабраліся — вёска свая як на далоні. От яму і рашаць, як і дзе добраўпарадкаванне ладзіць, каму ў першую чаргу дэфіцытны шыфер прадаць, каго за п'янку перад усёй вёскай паўшчуваць. Ёсць у нас некалькі селькомаў, душа радуецца, так справы там ідуць. Нараду цяпер раённую старшыняў селькомаў рыхтуем, скажам пра іх добрае слова...

Слухаю Сцяпана Піліпавіча з цікавасцю. І пра тое, якая гэта важная рэч — асабісты план работы дэпутата. І пра тое, што наспеў ужо, даўно наспеў час павысіць зарплату ў сельсаветах — на цяперашнюю не дужа падбярэш патрэбнага чалавека. І пра тое, якія харошыя людзі сабраліся ў грамадскім арганізацыйным аддзеле райвыканкома, якім ён, Сцяпан Піліпавіч, кіруе...

Шчыра скажу — ніколі не думаў, што пра ўсё гэта можна так цікава расказваць і слухаць. Сапраўды, не месца чалавек — чалавек месца красіць!

■ ■ ■

Пра ўсіх трох пачуў я ў Рагачоўскім райкоме партыі. Ад сакратара райкома Анаголя Аляксандравіча Глазоўскага.

— Гэта ж толькі лічыцца, што яны пенсіянеры і, значыць, выйшлі ў тыраж. А мы іх цвёрда сваімі работнікамі лічым. Усе трое — у складзе райкома, усе трое кіруюць райкомаўскімі камісіямі: Змушко — арганізацыйнай, Свярдлоў — ідэалагічнай, Драчоў — партыйнай. Мы ім часам гаворым: займайце, таварышы, кабінеты, павесім на дзвярах шыльдачкі з вашымі прозвішчамі і лічыце, што прыйшла да вас трэцяя маладосць. Усё роўна не таго вы гарту, каб адно мераць штодня ціск крыві ды на першае месца ў клопатах ставіць дыету і рэжым...

Я слухаў і думаў — вось яна, сталасць, вартая маладосці, вось ён, прыклад для тых, хто, атрымаўшы пенсіённую кніжку, забываецца на тое, чым жыў дзесяцігоддзі, дзічэе за парканам дачы і ў камунальных звадках...

Чуеш, гвардыя камуністаў! Цвёрда стаяць твае ветэраны на занятым у маладосці рубяжы. Адыдзі, старасць! Прэч, немач! Гвардыя — не здаецца!

г. Рагачоў.

ІДУ ПА ЗЯМЛІ

Вернасць жыццёвай праўдзе Б. Сачанка засведчыў у многіх творах яшчэ ранейшых сваіх кніг «Барвы ранняй восені» і «Зямля маіх продкаў», якія былі ўвогуле пазітыўна ацэнены крытыкай. У іх Б. Сачанка выступіў пераважна як апавядальнік. Яго кароценькія навелы ўзнаўлялі той ці іншы рэальны жыццёвы факт, не прэтэндуючы на шырокія абагульняючыя карціны, на раскрыццё чалавечага лёсу ў багацці і відавочнасці яго псіхалагічнага працэсу. Тая карціна, якая атрымлівалася пры «падсумаванні», была даволі мазаічнай. Але адчувалася, што пісьменнік стаіць перад неабходнасцю шырокага мастацкага сінтэзу сваіх назіранняў.

Сапраўды, з'явілася «Зямля маіх продкаў» — дарожны дзённік, у якім Б. Сачанка аддаў даніну любві і ўдзячнасці роднаму палескаму краю, яго гісторыі і сучаснасці, яго працавітым людзям, цудоўнай прыродзе... Сведчаннем узросшага, сталага майстэрства былі таксама апавяданні «Дзік-бадзяка», «Не, не ўсё роўна» і інш.

І вось перад намі яго — «Пакуль не развіднела». Гэта яшчэ адзін крок мастака ў напрамку на збліжэнне з жыццём, з яго праблематыкай, з яго мінулым і цяперашнім.

Зборнік складаецца з трох аповесцей, шэрага апавяданняў і некалькіх, як сказана ў анатацыі, «алегарычных прытчаў».

З аповесцей найбольш цікавай, на мой погляд, — і па змесце сваім, востра драматычным і напружаным, і па форме, з выкарыстаннем унутранага маналогу гераіні, — з'яўляецца «Пакуль не развіднела». У ёй ажывае суровая памяць ваенных гадоў — час, які стаў для савецкага чалавека выпрабаваннем яго ідэйнай і маральнай загартоўкі. Гераіню сваю, партызанскую сувязную Юлю («дзяўчына гадоў пад пятнаццаць — шаснаццаць, не надта прыгожая з твару, уся ў рабацінні, да таго ж цыбатая і худая» — так малюецца яе зусім не гераічны выгляд) — аўтар ставіць у выключна цяжкія абставіны: падполле даручае ёй адказнае заданне — пранесці да партызан праз узмоцнены паліцэйскі кардон важныя звесткі. Партызанскі атрад акружаны, на світанні немцы пачнуць карную экспедыцыю.

У такой сітуацыі часам абмяжоўваюцца займальным («дэтэктыўным») сюжэтам, бо матэрыял для гэтага як нельга больш удзячны. Але пісьменнік пайшоў па іншым, больш складаным і разам з тым больш плённым шляху. Асноўны канфлікт аповесці — паміж чалавечнасцю і фашызмам — распрацоўваецца ў псіхалагічным плане, ад чаго і мастацкае вырашэнне яго набывае сапраўдную верагоднасць і праўдзівасць. Аўтар паглыбіўся ва ўнутраны свет сваёй гераіні, прымусіў яе шмат думаць, успамінаць перажытае, даваенныя гады, лёс родных і знаёмых людзей.

Паралельна з перажываннямі Юлі ў аповесці раскрываецца іншы свет — змрочны свет шылахвостаў, чые блытаныя жыццёвыя шляхі прывялі іх да здрады. Аўтар разам з гераіняй задумваецца над прыродай адмоўных з'яў. Паклёпнік у адказны момант (а такім момантам з'явілася вайна) апускаецца да здрады, траціць чалавечае аблічча. Пісьменнік сурова асуджае духоўную мімікрыю шылахвостаў, якія ўмеюць прыстасавацца, «дагадзіць», а ўрэшце — і здрадзіць.

Аповесць «Пакуль не развіднела» ўспрымаецца як унутраны маналог гераіні, яе размова з самой сабой, са сваімі думкамі. Праўда, дзе трэба, усё гэта суправаджаецца аўтарскімі каментарыямі, бо пісьменнік хоча не толькі як мага паўней і глыбей зразумець маральныя і ідэйныя ўстоі, выхаваныя ў чалавеку новым ладам, а і, я б сказаў, робіць спробу па-мастацку даследаваць меру яго фізічных мажлівасцей. Пачуццё адказнасці, ідэйная пераконанасць, імкненне ў што б там ні стала перадаць партызанам папярэджанне падпольшчыкаў памнажаюць сілы і волю юнай гераіні.

Чалавек усё адолее, чалавечнасць пераможа, за ёю будучыня — такая думка паслядоўна і пераканаўча даводзіцца на старонках аповесці ўсім вобразным сэнсам твора. І гэта своеасабліва падкрэслена ў канцоўцы. На першы погляд здаецца, нібыта намаганні Юлі засталіся дарэмнымі. Адбылося так, што яе апярэдзіла другая, такая ж непрыкметная з выгляду дзяўчына і перадала партызанам патрэбныя звесткі, з якімі ішла да іх Юля. Але гэта толькі на першы погляд, бо на самой справе тут падкрэсліваецца заканамернасць перамогі гуманістычнага пачатку.

Тэматычны абсяг творчых шуканняў Б. Сачанкі ў апошняй кнізе шырокі. Побач з «Пакуль не развіднела» знаходзім і іншае, напрыклад, «Англіцкую сталь»,—палескую быль пра тое, як недзе на пачатку мінулага стагоддзя або яшчэ раней у палескія «джунглі» трапіў з камерцыйнымі мэтамі падуладны яе вялікасці каралевы Англіі нейкі Герберт Фостэр і што сталася з гэтага. І тут жа аповесць «на сучасную тэму» — «Баравое рэха».

«Англіцкая» сталь» —гэта не толькі этнаграфія (хоць і этнаграфія тут зусім да месца). Аповесць праўдзіва ўзнаўляе гістарычную старонку з жыцця беларускага Палесся, малюе яго свабодалюбівы народ, які дружна ўзнімаецца супраць паноў, што хацелі прадаць англічанам палескі лес. Па гэтай аповесці бачна, што Б. Сачанка плённа вучыцца ў такіх майстроў, як К. Паустоўскі і А. Платонаў.

Крыху падрабязней хочацца спыніцца на аповесці «Баравое рэха». Калі гаварыць коратка, то гэта — аповесць пра каханне.

Малады хлопец, студэнт, прыязджае на канікулы ў родную вёску і неспадзявана сустракае колішняе сваё юнацкае каханне — леснікову дачку Марту, якая паспела за час разлукі раптоўна (тут была і яго віна) выйсці замуж за трактарыста з геалагічнай партыі, а той к гэтаму часу паехаў некуды ў Сібір, пагнаўшыся за «доўгім рублём». У Змітрака (так звалі студэнта) ў горадзе таксама засталася дзяўчына, але сустрэча з прыгажуняй Мартай зноў усхвалявала яго. Праходзіць нейкі час, і Змітрок пераконваецца, што паранейшаму моцна кахае Марту. І тым не менш па віне аўтара паводзіць сябе неяк двухсэнсоўна, вагаецца, каго выбраць — Марту ці Валю, бо яны абедзве закаханы ў яго.

Дваістасць — прыкметная адзнака яго характару, якая адбіваецца і на каханні. Змітрок — гараджанін, які яшчэ не перастаў быць вяскоўцам. Нездарма ён кажа пра сябе: «дзіўна неяк у мяне бывае: у горадзе я нуджуся па дамоўцы, па вёсцы; варта ж толькі пажыць хоць тыдзень дома, у вёсцы, ірвуся назад у горад... Цела тут — душа там, цела там — душа тут...» Магчыма, таму і каханню яго не хапае цэласнасці, натуральнасці і смеласці. Усё гэта падмяняецца рэфлектыўным роздумам і вельмі «маральнай» медытацыяй ўжо ў нейкай меры чужога для вёскі гараджаніна. Замест жыцця засталася гульня ў жыццё. Паралельна з лініяй кахання аўтар там-сям спрабуе спыніць увагу героя на праблемах жыцця калгаснай вёскі, але выходзіць так, што аповесць не вытрымлівае гэтай «паралельнай» нагрузкі, як перагружаны самалёт, і пакідае ўражанне чагосьці недадуманага і не даведзенага да канца.

У аповяданнях — іх некалькі ў кнізе — у параўнанні з ранейшымі яго творамі малой формы пабольшала жыццёвага вопыту, аналітычнасці, псіхалагізму.

Па-свойму цікавыя і алегарычныя прытчы з цыкла «Гарод»...

У цэлым сустрэча з новай кнігай Б. Сачанкі прыемная. Яна пакідае ўражанне, што малады празаік удумліва і паслядоўна ідзе сваёй дарогай, шукае і знаходзіць натхненне ў самім жыцці, на сваёй роднай зямлі.

Ул. ГНІЛАМЁДАЎ.

Б. Сачанка. «Пакуль не развіднела». Выдавецтва «Беларусь», Мінск, 1966.

ХВАЛЮЮЧЫЯ ВЕРШЫ

Як чытач я адчуваў вялікае задавальненне, калі чытаў зборнік Пімена Панчанкі «Пры святле маланак». Амаль кожны верш хацелася перачытваць яшчэ і яшчэ раз. Здаецца, зусім простыя словы ляглі ў радкі верша, а якая ёмістая і глыбокая думка ў іх.

Дзе ж той край златакалосы,
край зялёны—
Рык ласіны,
Звон пчаліны,
Мора лёну?
Там, дзе Свіцязь, там, дзе
Прыпяць і Ясельда,
Дзе танцуюць пад цымбалы
на вяселлях...

Бачыце, як хораша і проста сказана ў вершы «Край паэтаў» пра нашу родную Беларусь. А такіх радкоў у кніжцы багата.

«Дзеці над возерам», «Акіян», «Святочныя салюты», «Сумленне», «У сорак першым», «Жыццё маё» і іншыя творы П. Панчанкі пакідаюць глыбокі след у душы.

Вельмі хвалюе верш «Родная мова». Колькі цёплых, шчырых і праўдзівых слоў знайшоў паэт, каб яскрава і ўзрушана сказаць пра сваю родную мову. У радасці і ў час нягоды ён, як маці, да грудзей сваіх гарачых яе прытульвае, аберагае яе і саграе сваім цяплом.

А верш «У гасцях» так і просіцца, каб вывучыць яго напамяць і расказаць сваім сябрам і знаёмым...

Перагорнута апошняя старонка кніжкі. Не хочацца з ёй расставацца. Таму я і ўзяўся за пяро, каб падзяліцца радасцю. Вялікую асалоду атрымаў я, чытаючы вершы Панчанкі.

М. КОЗЕЛ,
фінансавы работнік.
г. Мінск.

ПРА АЎТАРСКАЕ ПРАВА МАСТАКОЎ

У маскоўскім выдавецтве «Юрыдычная літаратура» сёлета выйшла з друку кніга У. К. Ісханава «Правы аўтараў твораў выяўленчага мастацтва». У ёй аўтар разглядае правы, якія маюць творчыя работнікі пасля заключэння дагавораў, выканання работы. Кніга ахапляе ўсе раздзелы ўзаемаадносін работнікаў выяўленчага мастацтва з заказчыкамі і з'яўляецца добрым юрыдычным дапаможнікам. Да таго ж яна напісана з улікам новага заканадаўства па пытаннях аўтарскага права.

З гэтай кнігай карысна пазнаёміцца нашым мастакам, скульптарам, майстрам дэкаратыўнага і прыкладнога мастацтва, мастакам тэатра, кінематографа, тэлебачання.

Ін. БАРАШКА.

Самабытны харавы калектыў вёскі Рудня-Стаўбуноўская Веткаўскага раёна нарадзіўся тры дзесяцігоддзі назад, і з таго часу не замірае ў ім творчае жыццё. На спеўні ходзяць рабочыя мясцовага саўгаса, настаўнікі, сельская моладзь. Кіруе хорам на грамадскіх асновах выкладчык Веткаўскай музычнай школы Станіслаў Гулевіч.

Хораша спявае хор беларускія народныя песні. Да фестывалю самадзейнага мастацтва, прысвечанага 50-годдзю Савецкай улады, вясковыя спевакі рыхтуюць новую праграму.

На здымку — хор беларускай народнай песні вёскі Рудня-Стаўбуноўская.

Фота В. ПРАТАПОПАВА.

Паэтычная паверка

Змітрок ПУЧЫНСКІ

ПРАВІНЦЫЯ — МОЙ ДОМ

Вы бачылі ўлетку жытнёвае
мора?
Вы чулі птушыны канцэрт
у гаях?
Цяжкі баравік вы прыносілі
з бору?
Вы знаеце кмену і аеру пах?

Вы зведалі стому ў разгар
касавіцы?
Складалі вы ў копы цяжкія
снапы?
Хвасталі вас ноччу
дажджы-навальніцы?
Глыталі гравіек раз'езджаных
пыл?..

Калі ўсё гэта вам добра знаёма,
Тады вы сумееце сэрцам адчуць,
Чаму я лічу гэты кут сваім домам,
Што людзі правінцыяй здаўна
завуць.

КІЕВУ

Дзень добры, бацька нашых
гарадоў!
Да сцен тваіх прайшоў я шлях
няблізкі.
Нібыта ў старажытнасці, гатоў
Я прывітаць цябе паклонам нізкім.

Гарыць Сафія ў небе маладым.
Дняпро гамоніць з даўнімі вякамі.
І на Крашчаціку шаўчэнкавы
сляды,
Як песню, помніць кожны мур
і камень.

Ты поўны непаўторнае красы,
Ты родны мне да найдрабнейшай
рыскі.
І я, славутых палачанаў сын,
Прынёс табе паклон братэрскі,
нізкі.

Уладзімір МІСУН

НА ДОСВІТКУ

На досвітку агонь зары сплывае
І вецер прачынаецца ў галлі...
І што гэта?
І хто гэта гукае?
— То белыя бярозы загулі.

Ядлоўца пах запанаваў наўкола,
Туман асеў на выстылай траве.
І хто гэта?
І што гэта?
— То золак
Над соннымі узлескамі плыве.

Нясмела птах разбуджаны
цвіркоча
У першароднай цішыні лясной.
І што гэта?
І хто гэта шапоча?
— То ранак умываецца расой.

Зірнула сонца у гушчар яловы,
У небе зазвінелі жаўрукі.
І хто гэта?
І што гэта?
— То новы
Пачаўся дзень, вясёлы, трапяткі...

ВАРТЫ ВЯЛІКАЙ ПАШАНЫ

ДА 70-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ УРЫ ФІНКЕЛЯ

У цяжкі 1944 год Кузьма Чорны аднойчы запісаў у сваім дзённіку: «Толькі што заходзіў на паўгадзіны У. Фінкель... Уры Фінкель належыць свайму народу і разам з ім варты вялікай пашаны. Гэта чалавек яўрэйскай культуры. Няхай да яго вернецца яснае шчасце душы».

Ракаўцы—землякі У. Фінкеля—яшчэ вельмі добра памятаюць невысокага сівога дзядулю з пышнымі вусамі. Пастукваючы сваім незаменным кіем, ён хадзіў па мястэчку, распытваў у мясцовых сялян і рабочых пра іх жыццё-быццё; у панядзелак, калі ў Ракаве збіраўся вялікі кірмаш, яго лёгка можна было знайсці сярод сялян навакольных вёсак — ён нешта старанна занатоўваў у сваю запісную кніжку. Кожны ведаў, што гэта — настаўнік рускай літаратуры мясцовай дзесяцігодкі, але далёка не кожны — што ён яшчэ і своеасаблівы крытык, вядомы літаратуразнаўца, здольны белетрыст. І ўжо, бадай, зусім ніхто не знаў пра яго цікавы, жыццёвы шлях, балазе сціпласць гэтага чалавека была непаказной...

Уры Фінкель нарадзіўся ў мястэчку Ракаў (Валожынскі раён) у канцы мінулага стагоддзя — 25 верасня 1896 года — у небагатай яўрэйскай сям'і. Лёс не скупіўся для яго — ні на благое, ні на добрае. У пятнаццаць год ён ужо самастойны чалавек, у пошуках заробку вандруе па шматлікіх гарадах і мястэчках Беларусі і Украіны. Некаторы час працуе на шахтах Данбаса. Затым займаецца ў Харкаўскім політэхнічным вучылішчы. Перад здольным юнаком Кастрычнік шырока расчыніў дзверы ў навуку. У 1918 годзе У. Фінкель паступае ў Маскоўскі універсітэт на эстэтыка-філасофскае аддзяленне філалагічнага факультэта. Аднак павучыцца як след не давялося. Пачалася грамадзянская вайна, і студэнт добраахвотнікам ідзе на фронт, служыць у Палітупраўленні 16-й Арміі, а затым — у Палітупраўленні ўсяго Заходняга фронту. У 1921 годзе ён дэмабілізуецца і накіроўваецца на працу ў Наркамасветы РСФСР, пасля ў Наркамнац РСФСР. Урэшце рэшт—родная Беларусь. У. Фінкель займае адказны пост у Наркамасветы БССР, вучыцца ў аспірантуры пры АН БССР, выкладае ў Мінскім педагагічным інстытуце (1930—1938 гг.). Затым — вайна, эвакуацыя. У Ракаўскім гета загінулі ад рук фашыстаў бацька, брат, дзве сястры пісьменніка. За вайну не стала таксама і дзвюх дачок-школьніц.

Пасля вайны У. Фінкель некаторы час жыве ў Ракаве (1949—1953 гг.), працуе ў школе і піша новыя даследаванні па яўрэйскай, рускай і беларускай літаратурах, збірае матэрыялы для рамана пра падзеі рэвалюцыі 1905 года ў Беларусі «Пяцьдзесят год таму назад». Памёр пісьменнік у Мінску ў 1957 годзе.

За сваё жыццё У. Фінкель надрукаваў шэсць арыгінальных крытыка-літаратуразнаўчых кніг. Некаторыя з іх вытрымалі па два-тры выданні, перакладзены на беларускую, рускую, грузінскую, армянскую мовы. Гэта — своеасаблівыя белетрызаваныя даследаванні пра класікаў яўрэйскай літаратуры А. Гольдфадэна, Мэндэле Мойхер-Сфорыма, Шолам-Алейхема і інш. Прозвішчы рускіх пісьменнікаў, творчасць якіх даследаваў У. Фінкель, складаюць доўгі спіс. Тут М. Гогаль, В. Бялінскі, М. Дабралюбаў, М. Чарнышэўскі, М. Ляскоў, М. Горкі... Зацікаўлена пісаў У. Фінкель і пра дзеячоў беларускай літаратуры. Яму належыць мастацкая біяграфія Зм. Бядулі, артыкул пра вядомага этнографа П. Шэйна. У цікавым апавяданні «У пошуках Івана Купалы» пісьменнік расказвае, як у змрочны дарэвалюцыйны час прыходзіць у бедную яўрэйскую сям'ю светлая «Жалейка» Янкі Купалы, каб навечна пасяліцца ў сэрцах простых людзей. Гэтым апавяданнем нібы сплачваўся доўг Янку Купалу, які асабіста ведаў пісьменніка, цаніў яго своеасаблівы талент.

У штодзённым жыцці У. Фінкель на першы погляд мог здацца наіўным, нават дзівакаватым. У яго былі дзесяткі планаў, праектаў, некаторыя з якіх, трэба сказаць па справядлівасці, былі нежыццёвымі. Аднак усе яны ішлі ад шчырага сэрца пісьменніка, жадання дапамагчы людзям чым можна. Разам з тым, з цягам часу многія яго «наіўныя» планы-мары станавіліся явай. Бо, няма чаго грахі таіць, у складаныя пасляваенныя гады наіўнасцю маглі здацца (і здаваліся) нават такія звычайныя, як на цяперашні час, прапановы пісьменніка — стварыць пры Ракаўскай дзесяцігодцы добры краязнаўчы музей, дзяцей навакольных вёсак прывозіць і адвозіць на спецыяльна выдзеленых падводах і т. п. А колькі давялося У. Фінкелю паваяваць з мясцовым начальствам, каб у «будаўнічы» пасляваенны час ураставаць ад поўнага вынішчэння цудоўны сасновы парк у родным мястэчку...

Так, гэты чалавек варты вялікай пашаны, добрай нашай памяці. І верыцца, што ў хуткім часе на хаце ў Ракаве, дзе нарадзіўся і доўгія гады жыў пісьменнік, будзе ўстаноўлена мемарыяльная дошка, а вуліца, на якой стаіць гэтая хата, стане называцца вуліцай Фінкеля.

В. РАГОЙША.

РАНІЦА НОВАГА ЖЫЦЦЯ

Выйшла ў свет новая аповесць Паўла Ткачова «Сэрца камунара»—пра бурныя дваццатыя гады. Гэта, можна сказаць, для маладога пісьменніка свая тэма. Яго апавяданні пра Леніна, сабраныя ў кніжцы «Вішнёвая квецень», з'явіліся добрым пачаткам і асновай, на якой грунтуюцца яго новыя намаганні ў распрацоўцы гісторыка-рэвалюцыйнай тэмы для юных чытачоў.

Я, відаць, не вельмі правінавачуся перад аўтарам, калі выдам адзін яго сакрэт: аповесць «Сэрца камунара» — толькі пачатак. Пачатак трылогіі, у якой пісьменнік мае намер прасачыць лёс трох юнацкіх пакаленняў—ад 20-х гадоў да нашых дзён. Кастрычнік, ленінскія бальшавіцкія ідэі, іх полымя ў сэрцах юных камунараў, полымя, пранесенае праз гады барацьбы, нялёгкіх страт і перамог, — так увогуле можна вызначыць пісьменніцкую задуму.

Здзяйсненне яе пачалося. Як? Разгорнем старонкі новай аповесці.

20-я гады. У беларускую вёску Гарадзішча з сібірскай ссылкі вяртаецца настаўнік Рыгор Васільевіч Шакун. У былым панскім маёнтку адкрываецца школа. Кулакі, бандыты ўсімі сіламі імкнуцца спыніць поступ новага жыцця. Такі фон. А на ім —разгортваецца барацьба характараў, думак, імкненняў. Пісьменнік ставіць сваіх герояў у вострыя драматычныя і нават трагічныя сітуацыі. І гэта як нельга лепей імпануе юнаму чытачу, яго тэмпераменту. Напружанасць яшчэ больш узмацняецца ўдалай пабудовай сюжэта, дзе дзве лініі — жыццё юных камунараў у Гарадзішчы і паездка Янкі Корзуна ў Маскву да Леніна — разгортваюцца, перарываючы адна другую ў самых хвалюючых момантах.

Пісьменнік штрых за штрыхам раскрывае перад чытачом вобразы герояў, лепіць характары.

Непахісным у сваіх перакананнях, чалавекам мужным і сціплым паўстае са старонак кнігі настаўнік Шакун. Радуе ўзнёсласць, камунарскі запал яго юных выхаванцаў. Прываблівае сваёй кемлівасцю дзед Нічыпар. Гнеў і абурэнне выклікаюць зацяты вораг усяго новага — поп, кулакі Шыбнёвы, «наменнік правадыра паведа» Бублікаў.

Хочацца адзначыць таксама добрае адчуванне П. Ткачовым часу, у якім адбываюцца падзеі твора. У аповесці трывала сцэментаваны мастацкі вымысел і гістарычная дакладнасць, удала спалучаецца палёт рэвалюцыйнай рамантыкі з трапнасцю бытавых дэталей. Усё гэта дае магчымасць аўтару стварыць запамінальную карціну бурлівых дзён станаўлення новага, савецкага жыцця.

Твор «Сэрца камунара» напісаны добрай мовай, пісьменнік удала ўводзіць жывую народную гаворку.

Акідваючы позіркам усю аповесць Паўла Ткачова, заўважаеш, праўда, што вобразам дарослых герояў пашанцавала больш: яны выпісаны больш паўнакроўна і каларытна, чым вобразы дзяцей. Аднак тут трэба, відаць, успомніць, што з юнымі героямі мы маем надзею сустрэцца зноў, і тады, хочацца думаць, характары іх раскрыюцца глыбей і паўней.

В. ЗУЁНАК.

П. Ткачоў. «Сэрца камунара». Выдавецтва «Беларусь» Мінск, 1966.

АПАВЯДАННЕ

— Матруна, і табе пісьмо!—крыкнула ў расчыненае акно Гэлька.—Магарыч піць пасля зайду!

Матруна якраз распальвала печ, каб рабіць вячэру, і пакуль падышла да акна, дык і след Гэлькі прастыў. А на стале сапраўды ляжала пісьмо. Ну і Гэлька! Адгадала, быццам ведала. Гэта ж надоечы Матруна выказвала ёй сваю скруху: «Носіш ты, Гэлька, штодня па торбе пісьмаў і таму, і другому, а мне не хочаш даць». Гэлька адказала: «Дам і табе—калі не заўтра, то паслязаўтра». І вось—так і ёсць.

Праўду сказаць, дык Матруна не вельмі і чакала пісьма, а сказала так Гэльцы хутчэй ад смутку, а не ад чакання. Ды і смутак такі, што і вініць як бы няма каго...

Яна ўзяла ў рукі канверт. Так, гэта ёй, Матруне. Пэўна ж, ад Платона, ад каго ж яшчэ. Яна і сама не сказала б, чаго чакала ад яго. Не, не магло быць у пісьме таго, на што Матруна тайком спадзявалася. Ведае яна гэта і ўсё ж хвалюецца, асцярожна разрываючы канверт... А можа... А можа?..

А ў памяці мільгаюць малюнкі то мінулага, далёкага, то блізкага, нядаўняга,—усё перажытае, многа разоў перадуманае, але яно чамусьці не забываецца, як непазбыўны боль...

Яна рана аўдавела. Засталася ў яе шыкоўная новая хата, багаты сад, гурт свіней у хляве і добра ўгноеная сядзіба аж на пяцьдзесят сотак. Ніхто ў Забор'і не меў такой гаспадаркі. Муж быў дбайны, працавіты, ашчадны, так што хоць не пакінуў яе без нічога. Але ж і нялёгка ёй адной было ўправіцца на ўсім гэтым, каб быў парадак. Ой, як папетлавалася тры гады, пакуль жыццё не звяло яе з Платонам.

Платон—з суседняй вёскі Малінава. У яго бацькі была вялікая сям'я—восем сыноў. Платон старэйшы. Дык як толькі яму споўнілася васемнаццаць, бацька і прысватаў яго да Матруны. А яна ж на дванаццаць гадоў старэйшая за яго. Ну, Матруна не дурная, каб не здагадвацца, што гэта на яе багацце паквапіўся Платон, а правільней, не Платон, а ягоны бацька. А яна што, яна была дужаю кабетай, якая яшчэ не адчувала цяжару гадоў, але затое паспытала ўжо смаку ўдовінай долі. Да таго ж Платон быў рослы і шыракаплечы хлопец... А ўрэшце—бог ведае, як усё гэта сталася.

Ці салодкая, ці горкая была ім уцеха, але нядоўгая. Маркоціўся Платон, цягнула яго да моладзі. Бачыла гэта і разумела Матруна, яна і сама раптам адчула сваю старэйшасць. І не стала няволіць Платона. Бывала, прыгатуе яму чысценькае адзенне і, як сына, адправіць ці на вечарынку, ці на фэст.

А як нарадзілася ў іх дзіця, Грышка, то ўжо для Матруны і свет закрыўся, як бы і не трэба быў ёй больш Платон. Неўзабаве яго і не стала дома—пайшоў служыць у армію. А цераз два гады, толькі б Платону з арміі вярнуцца, вайна пачалася...

Хапіла гора ў вайну Матруне, як і ўсім людзям. Страціла яна і хату, і сад, і хлеў, усё дабро. Але самае дарагое ўберагла—Грышку. З ім яна вітала нашых воінаў-вызваліцеляў.

Помніцца, не забудзецца тое гарачае лета. Кожны, хто перажыў страшную навалу, чакаў тады весткі ці пра сына, ці пра мужа, ці пра бацьку... Далёка па свеце параскідала вайна блізкіх людзей, і цяпер яны азываліся. Чакала і Матруна, але чакала прытоена і з болем. Не забылася, што не раўня яна з Платонам. Прадчувала, што калі і жывы дзе ён, то не вернецца да яе. Таму і сыну яна мала расказвала пра бацьку. А Грышку тады было якіх шэсць годзікаў, што ён разумеў. Але пытаўся часам. Матруна адказвала, што бацька, мабыць, недзе далёка і што пісьмо не паспела яшчэ прыйсці. А сама ныла і саромелася падзяліцца сваёй тугою нават з суседкамі. А потым не вытрывала, пайшла, узяўшы Грышку за ручку, да Платонавых родзічаў. Сказалі яны, што Платон жывы, у арміі, на фронце, і прыслаў ужо два лісты. Радавацца б Матруне, а яна быццам анямела. І нешта пякучае, як бяда, і прыкрае, як сорам, засмактала пад сэрцам.

І ўсю дарогу назад яна ішла подбегам і несла Грышку на руках; ён прасіўся: «Я сам... пусці, мама...», а яна туліла яго да грудзей і адгаворвала: «Нічога, родненькі... Так хутчэй... А то ж дома ўсё кінута-рынута...»

Зноў пабеглі-пацяклі дні за днямі. Не чакала ўжо Матруна нічога ад Платона. Змірылася і з гэтым. Што ж зробіш. Часам толькі папікала яго ў думках: «Дурны. Як дзіця. Саромеецца ці баіцца сказаць праўду ў вочы. Дурны. Няўжо ж я сляпіцаю палезу да яго...»

Мінуў яшчэ год. Скончылася вайна. Недзе далёка, у Берліне, ацихла яна.

Вярталіся салдаты дадому. Жыццё брала іншы разбег.

Матруна не чакала і не прычакала Платона. Усякае ў думках было, але цешыла сябе, што ў яе ёсць сын, што яна яго выгадуе і адна, супакойвала сваю жаночую гордасць тым, што і Платона можна зразумець: нашто яна яму, старая. Ну, а што няма ў яго турботы пра сына, дык Платон яшчэ малады, будуць у яго яшчэ і сыны і дочкі...

Так і жыла Матруна. Людзі памаглі ёй выбавіцца з зямлянкі—і свае вяскоўцы, і браты Платонавы—двое іх выйшлі з вайны жывыя—прыходзілі ці раз. Няхай сабе меншая хата, чым была да вайны, але ёй і не трэба вялікая. Хопіць для дваіх. Вырасце Грышка, дык некалі мо цагляную пабудуе. А ён ужо тым часам і ў школу ходзіць...

Яна дастала з канверта аркушок паперы, разгарнула яго, стала чытаць: «Матруна, піша табе Платон, ты ж ведаеш ад маіх братоў, што я жывы і здаровы. А табе не пісаў—на тое ёсць прычыны. Колькі таго некалі жыцця было ў нас. І нашто яно было. Ну ты невінаватая, не ты ж прыйшла да мяне, а я да цябе. Дык я віню аднаго сябе і не рашаўся пісаць табе. У вайну я быў цяжка паранены, і ўратавала мяне санітарка, каб не яна, то ці быў бы я на свеце. І з таго мы палюбіліся. Завуць яе Марыя. А як адпусцілі мяне з арміі, дык я паехаў да яе. Яна маладзейшая за мяне, харошая. Жывём добра, я на заводзе працую, Марыя ў бальніцы. Я расказаў Марыі ўсё, і мы рашылі забраць Грышку да нас. У нас кватэра ёсць, не будзе ён лішні, а яму будзе лепей, і школа блізка добрая, мураваная, і лепей тут вучаць настаўнікі, горад жа. Абдумай, Матруна, што я кажу, гэта сама правільна так зрабіць. Калі ты згодная, дык напішы мне або пра гэта накажы братам маім. Я прыеду і забяру Грышку. З прывітаннем Платон».

«Вунь чаго захацеў», — уздыхнуўшы, прашаптала Матруна і паклала пісьмо. Яна забыла і пра печ, дзе палалі дровы,—замаркоцілася, стоячы над сталом, задумалася. Спачатку была злосць на Платона, на тую невядомую ёй жанчыну, да якой з'ехаў ён. А потым разважыла: ды хіба ж яны наўмысна, з нядобрым намерам надумалі зрабіць яе зусім адзінокай? Яны ж хочуць дабра Грышку. А і праўда: няма тут яму выгоды, калгас на ногі не стаў, з адных сотак на сядзібах і жывуць людзі. А з Матруны работніца ўжо неважнецкая: прастрэленая рука так і не набрала ранейшай моцы, а тут яшчэ ў страўніку нейкая недабрата, з вайны ўсё, з галадоўкі... І самой цяжка, і Грышку нясоладка. А ў горадзе ён падрасце—і рамяство хутчэй прыдбае... Але ж як яна будзе без Грышкі, адна, як вядзьмарка якая? Ад гэтай думкі яна сцепанулася і ўспомніла пра вячэру. Падышла да печы, а там—адны вугольчыкі: не дровы—а палкі, успыхнулі, як запалкі, і няма. Матруна выйшла на прыдвотню. Уздыхнула. Няма гаспадара—няма і дроў добрых. Прыгадалася, як ссякала яблыні. Сад быў блізка каля будынін, дык калі гарэлі яны, то паабгарвала голле і на яблынях. Толькі дзве дальнія яблынькі і ўцалелі. Вунь беленькія, цвітуць... Казала Матруна Грышку: «Адна табе, адна мне. Якую ты выбераш?» «На каторай саладзейшыя яблыкі»,—адказаў ён. Дык хто ж будзе есці тыя яблычкі, калі Грыша паедзе?... Не, горкія яны стануць тады...

Толькі вярнулася Матруна ў хату, як уляцеў Грышка. З парога закрычаў:

— Праўда, бацька пісьмо прыслаў? Гэлька сказала...

— Адкуль яна ведае, ад каго пісьмо,—нездаволена азвалася Матруна і ўжо мякчэй, пасля паўзы, дадала:—Праўда. Вунь на стале.

Грышка скокнуў да стала, разгледзеў малюнак на канверце, тады дастаў пісьмо, паспрабаваў чытаць, але нічога не разабраў,—звярнуўся да маці:

— Што ён піша, мама?

— Піша, што хоча цябе забраць.

— Дык я ж яго ніколі не бачыў...

— Паехаў бы?

— Назусім?—спытаў Грышка і больш нічога не сказаў, задумаўся.

Матруна з любасцю і смуткам акінула яго позіркам. Ёй заўсёды падабалася, што Грышка з твару падобны на яе: і нос, як і ў Матруны, вастраваты, і вочы вялізныя, шэрыя, і бровы чарнявыя, ледзь не да вушэй; вось толькі валасы, як у Платона, жаўтававыя і рэдкія...

Грышка кінуў пісьмо на стол, а сам, насвіствае, залез на падаконнік.

Сонца ўжо заходзіла, яго праменні ўжо не грэлі і не сляпілі. Грышка пазіраў на сонца, забаўляўся, то заплюшчваючы, то расплюшчваючы вочы. Неўзабаве ён паведаміў маці:

— Гэлька бяжыць.

— Не Гэлька, а цётка Гэля,—лагодна, але строга стала павучаць Матруна.—Колькі разоў табе гаварыла, сынок, каб не зваў так. Яна ж табе не равесніца.

— Усе так завуць,—не здаваўся Грышка.

Тым часам Гэлька ўвайшла ў хату. Гэта была жанчына ў гадах, брыдкая, маленькая і худзенькая. З-за нізкага росту і павялося некалі зваць яе Гэлькай. А можа, яшчэ і таму, што з маленства была яна сіратою і жыла то ў адных, то ў другіх сваякоў. Яшчэ як была падлеткам, дык паставілі яе паштальёнам, і на гэтай рабоце яна і цяпер.

Гэлька адразу прайшла і села на лаўку каля стала—неабгабляваную вузкую дошку, прыбітую да двух хваёвых чурбачкоў.

— Магарыч я ўжо дарую на гэты раз,—пачала Гэлька.—Скажы хоць, што піша Платон. Мо вярнуцца надумаў?

— Мяне хоча забраць!—крыкнуў з падаконніка Грышка.

— Няўжо ж,—пацвердзіла Матруна.

(Заканчэнне на 4-й стар.).

БЕЛАРУСКІ СЯБАР СЯНКЕВІЧА

1966 год абвешчаны ў братняй Польшчы годам Сянкевіча. У маі літаратурная грамадскасць урачыста адзначыла 120-годдзе з дня нараджэння самага папулярнага ў свеце польскага пісьменніка. У юбілейныя дні ў Абленгорку, дзе ў свой час жыў раманіст, быў адкрыты мемарыяльны музей. Цяпер вядзецца падрыхтоўка да 50-годдзя з дня смерці Сянкевіча (15 лістапада). У сувязі з гэтымі датамі ўбачылі свет некалькі новых навуковых і навукова-папулярных выданняў.

Сярод новых даследаванняў, прысвечаных Сянкевічу, вылучаецца кніга літаратуразнаўцы Юльяна Кржыжаноўскага «Жыццё і справы Генрыка Сянкевіча» (Варшава, 1966). Гэта — навуковая біяграфія пісьменніка, складзеная на аснове яго пісем і ўспамінаў сучаснікаў. Для беларускага чытача яна цікавая тым, што ў ёй прыводзяцца новыя матэрыялы аб сувязях Сянкевіча з Беларуссю. Аказваецца, псеўданімам Літвос ён падпісваўся таму, што паходзіў са старажытнага «татарска-беларускага» роду. Пісьменнік неаднаразова бываў у маёнтку Дубнікі, які знаходзіўся на тэрыторыі цяперашняга Астравецкага раёна. Тут, у доме дзядзькі сваёй жонкі — Браніслава Мінейкі, Сянкевіч выношваў план рамана «Патоп», па дарозе з Маладзечна ў Дубнікі абдумваў сцэны «Пана Валадыёўскага». Паляванні ў ваколіцах Дубнік надоўга запомніліся пісьменніку. Уражанні тых часоў сталі асновай для пазнейшых паэтычных апісанняў беларускіх бароў і лясоў.

Юльян Кржыжаноўскі прыгадвае таксама, што, знаходзячыся ў Злучаных Штатах Амерыкі, Сянкевіч пазнаёміўся, а затым і пасябраваў з беларусам Юльянам Гарайнам, гаспадаром невялікага магазіна канцылярскіх тавараў у Сан-Францыска. Гарайн падарожнічаў разам з пісьменнікам па Каліфорніі, знаёміў яго з норавамі «Новага свету». Як вынік гэтай дружбы, засталіся 16 пісем Сянкевіча, поўных дасціпнасці і гумару.

Хто ж такі Юльян Гарайн і якім чынам ён трапіў у Амерыку. Пасля досыць працяглых пошукаў мне ўдалося знайсці сякія-такія звесткі пра беларускага сябра Сянкевіча.

Юльян Гарайн (1821—1883) нарадзіўся у Радашковічах. Закончыўшы Мінскую гімназію, вучыўся ў Маскоўскім універсітэце, а затым заняўся журналісцкай дзейнасцю. Эмігрываць у ЗША Гарайна, відаць, вымусілі рэпрэсіі царскіх улад пасля паражэння паўстання 1863 г. З Амерыкі наш зямляк прысылаў у польскія і рускія газеты і часопісы шматлікія карэспандэнцыі, у якіх, між іншым, палымяна выступаў у абарону індзейцаў. У Чыкага ўбачыў свет раман Гарайна «5 П-І Р» — едкая сатыра на тагачасную польскую шляхту.

У спадчыне Гарайна ёсць творы, якія маюць непасрэднае дачыненне да Беларусі і беларускай літаратуры. Гэта — успаміны «З жыцця паэта» (Львоў, 1886) і зборнік апавяданняў «Затрачаныя хвіліны» (Вільня, 1857). У прыватнасці, у кнізе «З жыцця паэта», прысвечанай Уладзіславу Сыракомлі, падрабязна расказваецца, пры якіх абставінах адбылося знаёмства Сыракомлі з Дуніным-Марцінкевічам. Паводле сведчання Гарайна гэтае знаёмства адбылося ў яго мінскай кватэры, на літаратурным вечары. Сярод удзельнікаў вечара мемуарыст называе ўрача і паэта Адама Пянкевіча, аўтара твораў для моладзі Ігнація Легатовіча, перакладчыка і філолага Флярыяна Чапелінскага, былога супрацоўніка віленскіх «Вядомосцяў бруковых» Францішка Дабкевіча, выдаўцоў Сыракомлі і Дуніна-Марцінкевіча братоў Бейліных. Кожны з іх, адзначае аўтар, «паклаў хоць адну цаглінку ў велічны гмах айчыннай літаратуры». Прысутнічаў на вечары таксама і «Вінцэнты Марцінкевіч, якога празвалі Гапонам у адпаведнасці з п'есай. Гэтую п'есу ён не толькі сам напісаў, але і іграў у ёй галоўную ролю ў самадзейным тэатры. Камедыя гэтая або камедыя-опера і іншыя яго творы на беларускім дыялекце былі надрукаваны ў Мінску...» Такім чынам, калі Гарайна не падводзіць памяць, у Дуніна-Марцінкевіча быў і сцэнічны варыянт «Гапона», аб якім нам цяпер нічога невядома.

Аб тым, што Гарайн не мог зблытаць «Гапона» з «Ідыліяй» («Сялянкай»), а Гапона — з войтам Навумам, сведчыць той факт, што ў зборнік «Затрачаныя хвіліны» ўключаны гарайнаўскі артыкул «Фізіялогія прыказак», дзе даволі падрабязна гаворыцца пра мінскую пастаноўку «Ідыліі» і нават прыводзяцца з яе цытаты.

Аднак вернемся да кнігі «З жыцця паэта». Яна дае багаты матэрыял для даследчыка творчасці Сыракомлі ўвогуле і яе сувязей з беларускім фальклорам у прыватнасці. Так, у кнізе апісаны адзін з вечароў, калі польскі паэт слухаў расказы начлежнікаў-беларусаў. Потым гэтыя расказы былі выкарыстаны ў дзесятым раздзеле паэмы «Народжаны Ян Дэмбарог». Сыракомля вельмі паважаў беларускіх сялян. Паехаўшы з імі на сенакос у глухое палескае ўрочышча Літвіноўка, ён памагаў ім грэбці сена, чытаў ім свае беларускія вершы. Абедаючы, Сыракомля садзіўся за адзін стол з прыгоннымі і патрабаваў, каб яму давалі такую ж самую ежу і такі ж самы посуд, што і ім.

Гарайн не ўнёс значнага ўкладу ў развіццё польскай ці, тым больш, беларускай літаратуры. У сваіх мастацкіх творах ён не ўзнімаўся над апісальніцтвам, голым этнаграфізмам. І ўсё ж яго зборнік «Затрачаныя хвіліны» заслугоўвае нашай увагі. Значную частку яго займае апавяданне «Фурманом — д'ябал», якое вызначаецца дэмакратызмам, антыпрыгонніцкай накіраванасцю. У ім аўтар расказвае пра сустрэчу са старым селянінам Рыгорам. Гаворка паміж ім і аўтарам вядзецца на той мове, «якой гавораць сяляне паўднёва-ўсходняй часткі Літвы». Гэтая мова вельмі мілагучная. На жаль, некаторая частка «грамадства, якая добра валодае заморскімі мовамі, лічыць гэтую мову нашага народа зусім чужой». Далей аўтар падрабязна пераказвае ўспаміны старога Рыгора аб тым, як сяляне яго вёскі расправіліся з жорсткім прыгнятальнікам немцам Шнапсам. Гэты чужаземец загнаў у магілу многіх вясковых хлапчукоў, якія служылі ў яго фурманамі, зганьбіў адзіную дачку Рыгора — Марынку. Але грамада адпомсціла Шнапсу: разам са сваёй чорнай карэтай ён апынуўся на дне рэчкі.

Звычаі мясцовай шляхты апісаў Гарайн у такіх апавяданнях зборніка, як «Варажба», «Напярэдадні дня св. Кацярыны» і інш.

Ю. Гарайн з'яўляецца прадстаўніком той часткі беларускай шляхты XIX стагоддзя, якая, не знайшоўшы сабе месца на роднай ніве, вымушана была аддаваць свае веды і талент іншым народам і іншым краінам.

А. МАЛЬДЗІС.

У ПАВЕТРЫ — ВОСЕНЬСКІ ЗВОН...



У школу дзеці прынясуць цудоўны восеньскі букет з лісцяў...



Старажытны масток у парку.



Апусцелі прыстані, пустуюць лодкі.

Плаваюць у сажалцы белыя лебедзі — гордасць гамяльчан.

Стаяць пагодлівыя восеньскія дні. У залаты ўбор прыбраліся паркі і гаі. Пунсавеюць на сонцы гронкі рабіны. У самай красе цяпер лёгкатуманная жоўтая восень.

Нязвыклая маўклівасць стаіць у парках і лясах. Радзеюць пышныя шаты клёнаў, ліп, бяроз, каштанаў, на зямлю паволі падае лісце... Не чуваць галасоў птушак. Паслухаць звонкую цішыню восеньскай раніцы прыйшлі ў Гомельскі парк дзеці. Ім весела. Вакол такая прыгажосць. У школу яны прынясуць цудоўны букет з лісцяў багатай восеньскай палітры фарбаў — жоўтых, палевых, чырвоных, карычневых.

Залатая восень сёлета ў Гомельскім парку імя Луначарскага. І хоць надвор'е становіцца з кожным днём халаднейшае, жыццё ў парку не замірае. Плаваюць у сажалцы белыя лебедзі. Прыходзяць з экскурсіямі на ўлонне прыроды школьнікі, выхаванцы дзіцячых садоў. У парку многа маляўнічых мясцін, ну хоць бы вось гэты куточак з такім прыгожым старажытным мастком. Пастаяць тут, памарыць — адна прыемнасць. Парк мае некалькі лодачных станцый. Летам, бадай, самыя мнагалюдныя месцы. А восень пакінула свой след: апусцелі прыстані, пустуюць лодкі.

Фота Ч. МЕЗІНА.
(Фотахроніка БЕЛТА).

ЦІКАВАЯ СУСТРЭЧА

У мінскім Доме мастацтваў адбылася цікавая сустрэча. У госці да работнікаў кіно прыйшлі мінскія архітэктары — галоўны архітэктар праектаў Ул. Марокін, галоўны эканаміст генеральнага плана Мінска Л. Кантаровіч, галоўны архітэктар «Мінскпраекта» Н. Шпігельман, галоўны інжынер праектаў Д. Краўцоў. Яны расказалі аб перспектывах развіцця беларускай сталіцы, аб прынцыпах забудовы мікрараёнаў, новым жыллёвым і культурным будаўніцтве.

У заключэнне адбыўся прагляд кінафільма «26 бакінскіх камісараў».

Р. КЛЯПЦОВА.

ДОМ НА «САПЁРНЫМ ПОЛІ»

Гэты дом на першы погляд нічым не адрозніваецца ад іншых катэджаў на адной з кіеўскіх вуліц са старой назвай «Сапёрнае поле».

Маё знаёмства з гаспадаром дома, стройным, рухавым, адбылося ў дзень яго сямідзесяцігоддзя. Было гэта ў цырку дзесяць год назад. Юбіляра, аднаго са старэйшых дрэсіроўшчыкаў, заслужанага артыста РСФСР Міхаіла Зола ўшаноўвалі горача.

Памятаю, ён з'явіўся на паравозе. Арэна ўяўляла сабою вакзал. Аб'явілі пасадку...

На перон выйшлі з меланхалічным пакракваннем качкі. Прайшлі да поезда парасяты. Прадэфіляваў да вагона дзікабраз. Занялі свае месцы куры, марскія свінкі. Не спяшаючыся, прайшлі прыгожа прыбраныя сабачкі-балерыны.

Праз шмат год я зноў у гасцях у артыста. Цяпер Міхаіл Зола — пенсіянер. Ён пасяліўся ў сваім доме разам з чацвераногімі сябрамі.

З гаспадаром чатырнаццаць сабак, шэсць малпаў і асёл, казёл, дзікабраз, марскія свінкі, барсук. Цікавыя жыхары. Яны не сядзяць без справы. Пра гэта ведаюць усе на вуліцы, і дзятва любіць зазіраць цераз плот, «прысутнічаць» на рэпетыцыях.

Так, у гэтым доме рэпетыцыі праводзяцца рэгулярна. Бываюць і канцэрты ў клубах і палацах культуры, зразумела, бясплатныя...

Рыгор АРАН
(АДН)

На той бок

АГОНІЯ ІХ МАСТАЦТВА

Гэта «новая» плынь у мастацтве знайшла сваё адлюстраванне нават на 33-й Міжнароднай выстаўцы гэтага года ў Венецыі. У павільёнах Англіі, Іспаніі, Італіі, ФРГ здзіўленыя наведвальнікі маглі бачыць, відаць, «лепшыя» ўзоры таго, што атрымала назву «кінетычнага мастацтва». Але там, у Венецыі, творы гэтага «мастацтва» былі ўсё ж не адзінокія, яны суседнічалі з работамі іншых напрамкаў...

Іншая справа ў Злучаных Штатах Амерыкі, дзе нядаўна экспанаваліся 72 работы васьмі амерыканскіх і чатырнаццаці еўрапейскіх прадстаўнікоў «кінетычнага мастацтва». Мастацкі музей у Сан-Францыска і карцінная галерэя пры Каліфарнійскім універсітэце сталі прытулкам для «ультрасучаснага мастацтва», піша амерыканскі часопіс «Ньюсуік».

Давайце больш падрабязна пазнаёмімся з апошнімі «шэдэўрамі» буржуазнага мастацтва, з апошнім крыкам мастацкай моды на Захадзе. Спачатку паглядзім, што гавораць пра «новую» школу, яе «тэарэтыкі». Цяжка, вядома, знайсці сярод шматлікіх выказванняў выразнае вызначэнне «кінетычнага мастацтва», але некаторыя характарыстыкі могуць сёе-тое растлумачыць. Палымяны прыхільнік «кінетызму», дырэктар мастацкага музея ў амерыканскім горадзе Берклі (паблізу Сан-Францыска) Пітэр Зельц тлумачыць: «У мінулым дзесяцігоддзі зліваліся ў адно жывапіс і скульптура. У цяперашні час у кінетычным мастацтве мы назіраем, як зрокавае і пластычнае мастацтва развіваецца ў часе, падобна музыцы і танцам. Мастак выступае як харэограф. Падобна таму як тэатр даўно ўжо выйшаў за рамкі авансцэны, так і скульптура сышла са свайго п'едэстала».

Трэба сказаць, што іншыя прыхільнікі «кінетычнага мастацтва» лічаць за лепшае гаварыць пра свой любімы прадмет не такімі вытанчанымі і высакапарнымі словамі. Скульптар Жан Цінгелі заяўляе, напрыклад, што «кінетызым вабіць публіку таму, што ён уяўляе сабою прыклад бязглуздасці нашага штодзённага механічнага бяздзелля». Больш папулярна растлумачыў сутнасць «кінетычнага мастацтва» прадстаўнік Заходняй Германіі Ота Піене. «Поп-арт, — гаворыць ён, — адлюстроўвае рэальнасць, мы ж імкнёмся змяніць яе. Поп-арт мае справу са спажывецкім грамадствам, мы ж імкнёмся аб'яднаць прыроду і тэхніку. І там, дзе прадстаўнікі поп-арта ўказваюць на шкоду, якую прыносіць тэхніка, мы не лічым, што такая шкода існуе. Мы не разглядаем машыны, як кашмар». Часопіс «Ньюсуік» лічыць, што «прадстаўнікі кінетычнага мастацтва кідаюцца ў самыя глыбіні тэхналогіі і плюхаюцца там падобна шчаслівым дэльфінам. Іх творы ўяўляюць сабою спакуслівыя спалучэнні натуральнага і механічнага, пабудаванага на асноўных элементах — ветры, вадзе, паветры, святле, агні, дыме — у сукупнасці з сучаснымі сродкамі: рухавікамі, магнітамі, радыёпрыёмнікамі, радарамі, вылічальнымі машынамі».

А цяпер пакінем убаку тэарэтычныя пастулаты і паглядзім, як яны ажыццяўляюцца. Што ж дэманстравалася на дзвюх выстаўках «кінетычнага мастацтва», арганізаваных у ЗША? Вось работа пад назвай «Вібратар», аўтарам якой з'яўляецца амерыканец Чарльз Матакс. Тут выкарыстаны фотаэлемент. І варта каму-небудзь прайсці паблізу, як пачынаецца шалёная вібрацыя «мастацкага» твора. Швейцарац Цінгелі выставіў рэч прасцейшую — самае што ні на ёсць мудрагелістае нагрувашчванне з адыходаў металу. Фон Гравеніц з ФРГ паказаў... калёсы, якія круцяцца.

Як піша «Ньюсуік», сярод выстаўленых работ назіраюцца «драматычныя кантрасты ў тым, што датычыць іх формы». Дакладна збалансіраваныя спіралі і лопасці Джорджа Рыкі прыводзяцца ў рух з дапамогаю ветру. А вось стальныя канструкцыі Лен Лапэ выкананы на больш высокім тэхнічным узроўні — іх рухі загадзя разлічаны і запраграміраваны. Канструкцыя Гары Крамера, зробленая з дроту, пачынае дрыжаць, калі ўключаецца невялікі маторчык. Ніколас Шэфер ствараe спалучэнне святла і гуку з дапамогаю люстра і металу. Чыліец Кастра-Сід выкарыстоўвае сціслае паветра, каб прымусіць рухацца пазалочаны шар і матылёк з пластыка. Ганс Хааке паказвае ваду ў сасудзе з плексіграса. Уручную можна выклікаць «дынамічныя» хвалі на вадзе. Такіх размясціў магніты і ртутныя лямпы ў сваіх чорных мадэлях сілы і энергіі.

Як запэўняе «Ньюсуік», ёсць на выстаўках і такія творы, якія перадаюць «больш інтымныя ўзаемаадносіны». Да іх часопіс адносіць дыскі, усыпаныя іголкамі, якія ціха дрыжаць і робяць пры гэтым гук, які нагадвае «шлюбную песню жука». Чарльз Матакс пайшоў яшчэ далей і з дапамогаю няхітрых прыстасаванняў стварыў збудаванне, названае ім «акном кахання»...

Няцяжка сабе ўявіць, што рабілася ў залах выставак, дзе былі паказаны гэтыя «шэдэўры» «кінетычнага мастацтва». Блукаючыя агні, заікастыя гучнагаварыцелі, зубчастыя калёсы і многае іншае давялося ўбачыць і пачуць наведвальнікам, якія з-за цікаўнасці пайшлі на гэты тэхнічны парад. Якая была іх рэакцыя? «Іх рэакцыя, — піша часопіс «Ньюсуік», — была самая розная — ад дзіцячага захаплення да скептычнага смеху». Часопіс прыводзіць выказванне адной наведвальніцы выстаўкі: «Я мяркую, што гэтыя хлопцы ў дзяцінстве ніколі не бачылі дзіцячага набору пад назвай «канструктар». Што ж, сказана даволі трапна і дасціпна.

Што датычыць самога часопіса «Ньюсуік», дык ён яўна сімпатызуе «кінетычнаму мастацтву». Аб гэтым гаворыць мноства пахвальных эпітэтаў у адрас многіх работ — яны, маўляў, і «арыгінальныя», і «дасціпныя», і «на дзіва ў многіх адносінах вабяць і паказваюць свае магчымасці». Вельмі высокай думкі аб сабе і сваіх «творах» прадстаўнікі новага «мастацтва». Чыліец Кастра-Сід, напрыклад, запэўняе, што чалавек будучыні будзе атрымліваць асалоду ад гэтага «мастацтва», удзельнічаць у ім.

Што гэта — яўныя адзнакі самасуцяшэння ці спробы штучна выклікаць цікавасць да таго, што ўспрымаецца зусім не як мастацтва, а як плён фантазіі людзей, часта нядрэнна знаёмых з тэхнікаю? Бадай, і тое і другое. Але што б ні гаварылі і ні пісалі на Захадзе прыхільнікі «новага» «кінетычнага мастацтва», ім ніколі не ўдасца пераканаць людзей у тым, што, скажам, са зношаных частак старога радара можна зрабіць твор сапраўднага мастацтва. Шуміха вакол «кінетызму» сведчыць аб глыбокім крызісе абстракцыянізму. З'яўленне «кінетычнага мастацтва», таксама як і поп-арта, гаворыць аб тым, што абстракцыянізм знаходзіцца ў стане паралічу. «Мастацкія» выкрутасы прыхільнікаў «ультрасучасных» плыняў успрымаюцца як спекулятыўныя дзівацтвы, у аснове якіх ляжыць эстэцтва і голы фармалізм. У падобнага рода, з дазволу сказаць, «мастацтва» няма і не можа быць ніякай будучыні.

Г. НАВІЦКІ.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

27 верасня

Першая праграма. 11.00 — тэлевізійныя навіны (М). 11.15 — «Подзвіг». Тэлевізійны альманах (М). 16.55 — праграма перадач. 17.00 — «З новага ўраджаю». Рэпартаж з Жабінкаўскага цукровага завода. 17.20 — для малышоў. «Чароўнае яйка». Лялечны фільм. «Казка пра цараўну і трох лекараў». Мультыплікацыйны фільм. 18.00 — тэлевізійныя навіны. 18.20 — «Музыка і час» (М). 19.00 — «Свет сёння» (М). 19.30 — «Непрыдуманыя апавяданні». Прэм'ера тэлевізійнага спектакля (М). 20.30 — тэлевізійныя навіны (М). 21.00 — да 50-годдзя Савецкай улады. «Сэрцам дакрануўшыся да подзвігу». Аб паходзе моладзі па месцах рэвалюцыйнай баявой і працоўнай славы бацькоў. 22.10 — канцэрт (М). 23.00 — «У свеце танца». Тэлевізійны часопіс.

Другая праграма. 17.00 — для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў. «Новы плашч Бураціна». Тэлефільм (М). 17.30 — рашэнні XXIII з'езда КПСС — у жыццё. «Агні «Электрасталі» (М). 17.50 — «Людзі новай пяцігодкі». Перадача са Свярдлоўска. 18.00 — тэлевізійныя навіны (М). 18.20 — «Дружба не ведае адлегласцей». Кінанарыс. 18.40 — па родным краіне. «Уніз па Енісею». Фотанарыс. 19.00 — рэклама, аб'явы. 19.10 — «Шлях да прычала». Мастацкі фільм. Вытворчасць кінастудыі «Масфільм». 20.35 — «Асенняя гастроль». Кінанарыс. 21.00 — для юнацтва. «Шукальнікі» (М). 22.00 — «Навука і тэхніка». Кіначасопіс (М).

28 верасня

Першая праграма. 11.00 — тэлевізійныя навіны (М). 11.15 — канцэрт (М). 16.55 — праграма перадач. 17.00 — для школьнікаў. «Школа пачынаючага спартсмена» (М). 17.30 — Усесаюзны фестываль самадзейнага мастацтва. «Галасы сяброў». Канцэрт. Перадача з гг. Гомеля і Куйбышава. 18.30 — «Штамп за пяць секунд». Рэпартаж з Мінскага экспериментальнага завода імя Гастэлы. 18.55 — канцэрт з твораў беларускай музыкі. 19.15 — тэлевізійныя навіны. 19.30 — «Магілёўскія сустрэчы». Тэленарыс. 19.55 — «Ул. І. Ленін аб культурнай рэвалюцыі» (М). 20.30 — «Балгарскія народныя танцы». Перадача з Сафіі. 21.00 — тэлевізійныя навіны (М). 21.30 — рашэнні XXIII з'езда КПСС — у жыццё. «Экзамен на сталасць». Аб гаспадарчым разліку ў саўгасах. Выступленне начальніка Упраўлення фінансаў Міністэрства сельскай гаспадаркі БССР Р. Р. Гольдмана. 21.50 — з гісторыі музычнага мастацтва. П. І. Чайкоўскі. «Сентыментальны вальс». 22.20 — «Раніцай». Мастацкі фільм. Вытворчасць кінастудыі імя М. Горкага.

Другая праграма. 18.30 — «Панарама Радзімы» (М). 19.00 — В. Кятлінская. «Ля пераправы». Р. Зярнова. «Гарадскі раманс». (Тэлеспектакль). (М). 19.55 — «Мсье Жак і іншыя». Мастацкі фільм. Вытворчасць кінастудыі «Арменфільм». 21.30 — у эфіры — «Маладосць» (М). 22.15 — канцэрт артыстаў Маскоўскага тэатра аперэты (М).

29 верасня

Першая праграма. 16.55 — праграма перадач. 17.00 — для школьнікаў. «Як нараджаецца дружба». Перадача з Ленінграда. 17.30 — для дзяцей. «З наваселлем, лялькі!». 18.30 — першынство СССР па футболу. ЦСКА — «Дынамо» (Масква) (М). У перапынку — тэлевізійныя навіны (М). 20.15 — «Музычны маяк» (М). 20.30 — тэлевізійныя навіны (М). 20.55 — «Турнір дапытлівых». Каляндар-віктарына. 21.50 — «Дом насупраць». Кароткаметражны фільм. 22.20 — П. І. Чайкоўскі. «Поры года». Выконвае аркестр рускіх народных інструментаў імя В. Андрэева. Перадача з Ленінграда.

Другая праграма. 17.30 — «Людзі новай пяцігодкі». Перадача з г. Горкага. 17.45 — «На шклянку чаю» (М). 18.00 — «Увага, якасць!». Перадача з Ленінграда. 18.30 — для малышоў. «Церамок». Мультыплікацыйны фільм. 19.00 — «Жнівеньскія зоркі». Тэленавела. 19.30 — «Спявае Сяргей Лемешаў». Фільм-канцэрт. 20.45 — рэклама, аб'явы. 20.55 — «Безбароды падманшчык». Мастацкі фільм (М).

ВАЙНА ВЯРНУЛАСЯ...

(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.).

— Дык жа добра жыве, мусіць? — распытвала Гэлька. — І, мусіць, прылабуніўся там да нейкай?..

Матруна расказала ўсё.

— Бачыш жа, азваўся, сына ўсё ж успомніў, — раздумліва прамовіла Гэлька, і не пазнаць было — хваліла яна Платона ці асуджала. — Дык што ж ты адпішаш яму?

— А як зрабіла б ты на маім месцы?

— Без паўлітра не разбярэшся, — пачала жартам Гэлька. Паківалася на лаўцы, раздумваючы, тады сказала: — Шкада аддаваць малое невядома куды... Каб жа ты дужая была, каб жа не твая хворасць ды не рэзрух у гаспадарцы, то б так... А Грышку, можа, і латвей там было б. Не адгадаеш толькі... А як, бывае, няўзлюбіць тая? Мачыха ж будзе Грышку!..

— А я паеду, — зноў падаў голас Грышка. — Будзе кепска — назад вярнуся.

— Глядзі ты, разважыў! — усклікнула Гэлька. — І праўда ж!

— Бог ведае, дзе праўда, — тужліва прамовіла Матруна.

Доўга яшчэ рахаваліся жанчыны.

Не адпісала Матруна Платону. Здаецца, цвёрда пастанавіла — не аддасць сына. А ў душы жыла нейкая няпэўнасць. Мінулі дні, а няпэўнасць не праходзіла, і Матруна часта раздумвала над лёсам Грышкі. А тут яшчэ ён сам ці раз успамінаў: «Калі ж я паеду да бацькі?» І Матруна зноў варажыла і так і гэтак. Аднойчы паехала з Грышкам у мястэчка, сфатаграфавалася разам з ім. Казала: «Як пакінеш мяне, сынок, дык я хоць на картачку буду пазіраць...» Жаль разбіраў Грышку, як слухаў гэта, і ў такія хвіліны яму расхочвалася ехаць да бацькі.

І вось ужо картачка вісіць у рамцы на сцяне, а пра Грышкаў ад'езд Матруна маўчыць. Напаткаўся ёй неяк Платонаў брат, яна і сказала, што сама выгадуе Грышку, без Платонавай дапамогі. «Так і напішы яму», — злосна дадала.

Урэшце і Грышка перастаў успамінаць пра ад'езд у горад, забыўся. Лета ж, цэлымі днямі гойсае Грышка па вёсцы ды па ваколіцах, што хочаш забудзе.

Ды вось аднойчы, у суботу, наказваюць Матруне з Малінава, каб прыслала туды заўтра, у нядзельку, Грышку: Платон прыехаў, падарункаў навёз.

Крыўдна стала Матруне. «Сам сюды і вачэй паказаць не хочаш, — думала яна. — А мо наважыў падгаварыць, зманіць з сабою дзіця?.. Дык жа не дажджэшся ты Грышкі... Скулу табе, а не Грышку!»

І яна нічога не сказала сыну. Не сказала, а на душы было кепска. І таму, што хавала ад сына вестку пра бацьку; калі-небудзь даведаецца Грышка, будзе крыўдаваць, папікаць яе ў несумленнасці... І таму, што пры цяперашняй яе бядноце добра было б атрымаць тыя падарункі для Грышкі; пэўна, з вопраткі нешта прывёз Платон, а Грышка ж вунь як абнасіўся...

Доўга не магла заснуць у той вечар Матруна. Раніцай ледзьве стрывала, каб не сказаць Грышку пра бацьку. І ўжо сказала б, ды ён угнявіў яе: яна загадала яму выгнаць з хлява ды папасвіць кабанчыка, а ён закрычаў: «Не-не-не! Мяне хлопцы чакаюць». І вышмыгнуў з хаты. Неслух. І ўшчувае Матруна яго, і разумее як быццам усё хлопчык, а от, бывае, і не слухаецца. Ну, ды дасць бог, вырасце чалавекам, самае цяжкае ўжо мінулася.

І згадалася вайна. Многа зведала Матруна і страху, і голаду, і холаду. Грышка ж быў тады маленькі, нязнака. Цяжка з ім было. Колькі разоў над імі вісела смерць на валаску. А ў той дзень, як немцы, адступаючы, падпалілі вёску, дык Матруна наогул ужо была развіталася з жыццём. Схапіўшы Грышку, яна ўцякала да лесу, але трапіла пад кулі, і якраз жа на поплаве, дзе роўненька — ні каменя, ні кусточка, ні ямінкі. Але бегчы няма як. Упала Матруна, прыкрыла сабою Грышку і рашылася: няхай забіваюць яе, а Грышка, можа, і ўцалее... Бзыкаюць кулі, свішчуць, сэрца замірае ад страху. Грышка стаіўся, ні жывы ні мёртвы. Раптам смальнула Матруне ў руку. Скаланулася яна, боль падымаў яе, прымушаў падхапіцца, а страх быў мацнейшы. Так і ляжала. Апомніўшыся, чула, як цячэ з рукі кроў, але баялася нават паварушыцца. Ужо і сціхлі стрэлы, а яна яшчэ доўга ляжала. Потым найперш варухнула прастрэленаю леваю рукою: баліць, не ўтрываць... Прыўзнялася, бачыць, Грышкава шыя ў крыві, а ён ляжыць ціхенька... Ускрыкнула Матруна. Тады і Грышка падхапіўся... Здагадалася яна, што гэта ж яе кроў нацякла на Грышку...

Дык як жа пасля гэтага паслаць дзіця ў далёкі горад, не бачыць яго штодня, не чуць яго голасу?..

Матруна зрабіла сёе-тое ў хаце, тады ўзяла кошык, каб ісці ў грады, навыбіраць гуркоў для засолу, а то жаўцеюць.

На ганку сутыкнулася з Гэлькаю. Падумала: «Пэўна, прачула пра Платона, дык бяжыш выведаць, што і як...»

Так яно і было. Ну, ды ад Гэлькі Матруна нічога не тоіць. Сказала ўсё, як ёсць.

— А ты б узяла ды сама схадзіла, — параіла Гэлька. — Няўжо табе не цікава глянуць на былога мужыка? Дзябал з ім, што ён ужо не твой... Ды і падарункі забрала б.

— Не пайду, — адказала Матруна. — Няхай ён падавіцца тымі падарункамі... Ён жа, няйначай, хоча зманіць Грышку.

У гэты момант паветра страсянулася ад недалёкага выбуху.

— А божа ж мой, — прашаптала Матруна і, кінуўшы кошык, выбегла з двара. За ёю і Гэлька.

Выбух данёсся з узлеска, што за выганам. Жанчыны пазіралі ў той бок.

— Міна ці снарад, — прамовіла Гэлька. — З вайны ўсё. Кажуць жа, і дзесяць гадоў можа праляжаць у зямлі ці хоць у вадзе, а ўсё адно выбухне... От жа, скажы, зараза...

— Грышка... Дзе ж Грышка? — занепакоілася Матруна. — Куды ж ён пайшоў? — Яна ўбачыла, як на ўзлесак паімчаліся дзеці, і памкнулася была сама туды, але ўраз жа замерла. Ёй страшна было нават падумаць, што з Грышкам магло нешта здарыцца: ёй здалося, што калі яна так падумае, калі яна пабажыць на выбух, дык тады... Не, яна не магла закончыць гэтую думку...

— Гуляе недзе твой Грышка, — супакойвала Гэлька, — чаго ты ўжо без прычыны хвалюешся. Адвыклі мы ад вайны, хай яна ніколі не вернецца, дык вось бухнула раз, а ў нас ужо душа ў пятках. А помніш... — І яна пачала ўспамінаць перажытае ў вайну. Матруна то слухала, то сама гаварыла.

Яны, размаўляючы, вярнуліся на двор. Матруна ўзяла кошык, каб ісці ў грады, але ад Гэлькі не так хутка адчэпішся.

Прыцішаны тупат, што пачуўся з вуліцы, з-за хаты, перапыніў іх гаворку.

Матруна павярнулася і ўбачыла Сцяпана Лысюка, старшыню калгаса, з нейкай ношай на руках; ношу яна не адразу разгледзела, бо Сцяпан быў абкружаны маўклівым натоўпам падлеткаў і жанчын. Паварочваючы на двор, натоўп расступіўся, даючы дарогу Сцяпану...

— Грышка! Сынок! — закрычала Матруна і кінулася насустрач.

Натоўп спыніўся. Толькі Сцяпан ішоў, несучы Грышку. Матруна з працягнутымі рукамі адступала перад ім.

— Нежывы? Насмерць? Людзі!.. — загаласіла яна.

— Я на веласіпедзе якраз ехаў, — загаварыў да яе Сцяпан, — і адразу туды... Гэта па той бок канавы, дзе мост быў... Трое іх было.. Ну, дваіх ушчэнт... А гэты жывы яшчэ быў...

Ён унёс Грышку ў хату, паклаў на ложак.

Матруна ўпала на калені, цалавала Грышку ў збляднелы замурзаны твар, галасіла, а то, сціхаючы, прыкладвалася вухам да яго скрываўленых грудзей: потым закрычала, як у бяспамяцтве:

— Ды ў яго ж адной ручкі няма!.. А мой жа ты сыночак, дзе ж твая ручка?.. — Яна раптам падхапілася, выскачыла з хаты і пабегла да канавы.

«Хаця б чаго не сталася там з жанчынай», — падумала Гэлька і пабегла ўслед за ёю...

Грышкаву руку так і не знайшлі. Можа, выбухам разнесла яе на дробныя кавалачкі або закінула ў канаву.

Матруна несупынна галасіла, кленучы сябе:

— Сыночак мой родны, галубочак мой, праклятая ты мяне на тым свеце, гэта ж я вінаватая ў тваёй смерці!...

— Вайна вінаватая, — супакойвала яе Гэлька. — Вярнулася от, праклятая...

Матруна не чула яе.

Платон, не дачакаўшыся Грышкі, выправіўся ў Забор'е. «Ну што ж, — разважаў ён сам з сабою, — няхай хлопчык жыве і тут, раз маці так хоча... За ёю ж першае права... Буду памагаць ім...» У руцэ ён нёс ладны пакуначак — там быў касцюмчык, сарочка і сандалікі... Падарунак Грышку...

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, Г. М. БУРАЎКІН, А. І. БУТАКОЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, Т. А. ДУБКОВА, Г. М. ЗАГАРОДНІ, В. Ул. ІВАШЫН, А. М. КАШКУРЭВІЧ, В. Б. ЛАДЫГІНА, П. М. МАКАЛЬ, А. Н. МАРЦІНОВІЧ, Р. К. САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), І. А. САНКОВА, З. Ф. СТОМА, М. Г. ТКАЧОЎ, Р. Р. ШЫРМА.

Праўленне Саюза пісьменнікаў БССР выказвае глыбокае спачуванне пісьменніку Пятру Шасцерыкову з прычыны напаткаўшага яго горя — смерці маці.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

Друкарня выдавецтва «Звязда». Індэкс 63856.
АТ 01852